Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

18 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.
СУБОТА
№ 198 (26311)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 567

Аб звальненні ў запас ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы, якія выслужылі ўстаноўленыя тэрміны ваеннай службы па прызыву, і прызыве грамадзян на тэрміновую ваенную службу ў кастрычніку — снежні 2008 г. і студзені 2009 г.

(Вынятка)

1. Звольніць у запас ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы, якія выслужылі ўстаноўленыя тэрміны ваеннай службы па прызыву.

2. Прызваць у кастрычніку — снежні 2008 г. і студзені 2009 г. на тэрміновую ваенную службу грамадзян Рэспублікі Беларусь мужчынскага полу, якім да дня прызыву споўнілася 18 гадоў і якія не маюць права на адтэрміноўку ад прызыву, а таксама грамадзян прызыўнога ўзросту, якія страцілі права на адтэрміноўку.

3. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, абласным, Мінскаму гарадскому выканаўчым камітэтам забяспечыць выкананне мерапрыемстваў, звязаных з прызывам грамадзян на тэрміновую ваенную службу, у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

4. Міністэрству абароны да 1 лютага 2009 г. накіраваць прызваных на тэрміновую ваенную службу грамадзян ва Узброеныя Сілы, іншыя войскі і воінскія фарміраванні Рэспублікі Беларусь у межах колькасці згодна з дадаткам*.

5. Устанавіць, што пацярпелыя ад наступстваў катастрофы на Чарнобыльской АЭС грамадзяне, прызваныя на тэрміновую ваенную службу, накіроўваюцца ў воінскія часці і фарміраванні, якія не знаходзяцца на радыеактыўна забруджаных тэрыторыях, і назначаюцца на воінскія пасады, не звязаныя з работамі па эксплуатацыі крыніц іанізуючага выпраменьвання, звышвысокіх частот і работамі з кампанентамі ракетнага паліва.

6. Беларускай чыгункі забяспечыць па заяўках Міністэрства абароны, іншых дзяржаўных органаў, у якіх прадугледжана ваенная служба, перавозку ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы, якія выслужылі ўстаноўленыя тэрміны ваеннай службы па прызыву, і грамадзян, прызваных на тэрміновую ваенную службу.

7. Ваенным камісарам на падставе адпаведных рашэнняў раённых (гарадскіх) прызыўных камісій накіроўваць у органы пракуратуры матэрыялы на грамадзян, якія ўхіліліся ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, для прыцягнення іх да адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

8. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь да 20 сакавіка 2009 г. прадставіць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь інфармацыю аб выніках прызыву грамадзян на тэрміновую ваенную службу.

9. Гэты Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

* *Для службовага карыстання.*

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

16 кастрычніка 2008 г., г. Мінск.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў І. Аліева з перамогай на прэзідэнцкіх выбарах у Азербайджане

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Ільхама Аліева з перамогай на выбарах Прэзідэнта Азербайджанскай Рэспублікі.

«Народы Беларусі і Азербайджана аб'ядноўвае агульнае імкненне жыць у міры і згодзе, весці адкрыты і паважлівы дыялог на карысць працвітання нашых краін. Упэўнены, што Ваша далейшая дзейнасць на вышэйшай дзяржаўнай пасадзе будзе садзейнічаць сацыяльна-эканамічнаму развіццю Азербайджана, павышэнню яго міжнароднага аўтарытэту і ўмацаванню беларуска-азербайджанскіх сувязяў па ўсіх напрамках», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ХЛЕБНЫ ЗУБР

Фігурны хлеб-каравай у выглядзе белавежскага зубра, выпечаны на Давыд-Гарадоцкім хлебазаводзе Столінскага раёна, нялёгка падняць нават тром мужчынам. Галоўны інжынер прадпрыемства Віктар ДРАНЬКО, інжынер-механік Алег ГАЙКЕВІЧ і вадзіцель Міхаіл КРУГЛІЧ нясуць хлебную фігуру на свята старажытнага горада (на фотаздымку). Дарэчы, сёлета «зубр» пабываў ужо на абласных і нават рэспубліканскіх Дажынках.

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

26 КАСТРЫЧНІКА СТРЭЛКІ ГАДЗІННІКАЎ ПЕРАВОДЗЯЦЦА НА 1 ГАДЗІНУ НАЗАД

У Беларусі завяршаецца перыяд дзеяння «летняга» часу. Традыцыйна гэта прыпадае на апошнюю нядзелю кастрычніка, паведамілі БЕЛТА ў Міжгаліновай камісіі часу, частаты і вызначэння параметраў вярчэння Зямлі Рэспублікі Беларусь.

У сувязі з гэтым 26 кастрычніка ў 3 гадзіны ночы стрэлкі гадзіннікаў на ўсёй тэрыторыі Беларусі пераводзяцца на 1 гадзіну назад.

ЗНОЎ ДАЖДЖЫ, А ЎНАЧЫ ЗАМАРАЗКІ

У выхадныя на тэрыторыі Беларусі будзе гаспадарыць вільготная, але нявызначэння паветраная маса, якая завітала да нас з боку Балтыйскага мора, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.

Таму ў суботу месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах Віцебскай і Магілёўскай абласцей узмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра 6—12 градусаў. У нядзелю ўначы па поўначы краіны, а ўдзень паўсюдна пройдуць невялікія дажджы. Тэмпература паветра ўначы 2—7 цяпла, на тарфяніках Палесся замаразкі ад 0 да мінус 2 градусаў, удзень 7—13 цяпла. У панядзелак уначы месцамі, а ўдзень па Віцебскай вобласці кароткачасовыя дажджы, уначы і раніцай слабы туман. Тэмпература паветра ўначы плюс 3—8, на тарфяніках Палесся месцамі замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў, удзень 7—13 цяпла.

Чакаецца, што ў аўторак і сераду будзе ўжо сонечна. Тэмпература паветра ўначы 2—7, удзень 9—16 цяпла. А вось з чацвярга зноў пойдуць восеньскія халодныя дажджы.

Сяргей КУРКАЧ.

ЦЭНЫ НА НАФТАПРАДУКТЫ НА ЎНУТРАНЫМ РЫНКУ БЕЛАРУСІ ЗНІЖАЦЬ НЕ ПЛАНУЕЦЦА

Аб гэтым паведаміў міністр эканомікі Мікалай Зайчанка.

Паводле яго слоў, «пакуль ніякіх пераглядаў у бок змяншэння цэнаў на нафтапрадукты не намячаецца». Міністр аргументаваў гэта стратнасцю паставак нафтапрадуктаў цяпер на ўнутраны рынак.

Гаворачы пра экспарт беларускіх нафтапрадуктаў, Мікалай Зайчанка сказаў, што Мінэканомікі не прагназуе рэзкага скарачэння яго аб'ёмаў. Пакуль такіх тэндэнцый няма, хоць цэнавыя тэндэнцыі ідуць уніз, дадаў ён. Міністр адзначыў, што фінансавы крызіс не можа абмінуць ні адну дзяржаву. «Пытанне толькі ў тым, у якой ступені ён паўплывае на эканоміку той або іншай краіны», — дадаў Мікалай Зайчанка.

МТЗ-80 ПЕРАКУЛІЎСЯ Ў АРЭСУ

Ва ўчарашнім нумары «Звязда» паведамляла аб здарэнні ў Любанскім раёне, дзе падчас нарыхтоўкі сіласу на полі паблізу вёскі Даросіна перакуліўся трактар і загінулі два чалавекі. І вось чарговае падобнае няшчасце, зноў у гэтым жа раёне.

Як удакладнілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе УУС Мінаблвыканкама, паблізу ад вёскі Дворышча трактар кульнуўся ў раку Арэса. Кіраваў МТЗ-80 22-гадовы мясцовы жахар, а тэхніка належыць Любанскаму райагрсэрвісу. Акрамя вадзіцеля ў кабіне трактара таксама знаходзіўся 20-гадовы работнік райаграсэрвісу, жыхар Дворышча. Паводле папярэдняй інфармацыі, трактарыст не справіўся з кіраваннем, у выніку чаго МТЗ-80 і перакуліўся ў ваду. На жаль, і ў гэтым выпадку выратавацца ні вадзіцелю трактара, ні пасажыру не ўдалося.

Ігар ГРЫШЫН.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

22 кастрычніка 2008 г. у 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу адзінаццатая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Аўтарытэтна

ЯКІМІ БУДУЦЬ СТАЎКІ ПА КРЭДЫТАХ?..

Банкі спрабуюць засцерагчы сябе ад небяспекі, у тым ліку шляхам павышэння працэнтных ставак па крэдытах

Тое, што фінансавы крызіс не абмінуў бокам ужо многія краіны і адбіваецца на якасці жыцця іх грамадзян — гэта факт. Размовы, што вядуцца экспертамі наконт магчымага пагаршэння эканамічнай сітуацыі ў свеце, прымушаюць большасць людзей, тых жа амерыканцаў, ды і нашых бліжэйшых суседзяў расіян задумацца над тым, як з найменшымі стратамі ўсё гэта перажыць. Пэўныя высновы з таго, што адбываецца, зразумела ж, робяць і ў нас.

Напрыклад, адзін з чытачоў нашай газеты таксама ўважліва сочыць за развіццём падзей, а таму вырашыў прытрымлівацца адной з парад, якіх цяпер эксперты робяць шмат: маўляў, хопіць ужо збіраць грошы і невядома чаго чакаць — самы час укласці свае зберажэнні ў дарагую рэч, аб якой марыў даўно, — у аўтамабіль. Капіталу не хапала, таму ён звярнуўся ў адзін з банкаў па крэдыт. Аднак там яму ў ім адмовілі, патлумачыўшы, што часова не выдаюць крэдыты на аўтамабілі. Як аказалася, сітуацыя, з якой сутыкнуўся канкрэтны чалавек, не адзінкавая: шэраг банкаў, сапраўды, прыпынілі выдачу грамадзянам крэдытаў на набыццё аўтамабіляў і будаўніцтва жылля, альбо ўзнялі працэнты па такіх крэдытах. Каб праясніць, што насамрэч адбываецца, і высветліць, чаму некаторыя фінансавыя ўстановы не працуюць з праграмамі па крэдытаванні, узнімаюць працэнтныя стаўкі, мы звярнуліся па каментарый да **начальніка галоўнага ўпраўлення банкаўскага нагляду, члена Савета дырэктараў Нацыянальнага банка Беларусі Сяргея ДУБКОВА.**

— Па-першае, тое, што адбываецца цяпер на міжнародных фінансавых рынках, мае ўжо назву — фінансавы крызіс, — гаворыць Сяргей Дубкоў. — Па-другое, любыя крызісныя з'явы ў эканоміцы маюць некалькі ступеняў, некалькі глыбіняў. Пасля фінансавага крызісу, калі ён не будзе спынены мэтанакіраванымі дзеяннямі цэнтральных банкаў і ўрадаў, наступаюць праблемы ў астатніх сектарах эканомікі. Ужо прагучалі адпаведныя заявы высокапастаўленых чыноўнікаў міжнародных арганізацый аб тым, што найбуйнейшыя эканомікі свету знаходзяцца напярэдадні альбо ўступаюць у працэс рэцэсіі, гэта значыць, калі істотна зніжаюцца тэмпы росту эканомікі. Вось чаму цэнтрабанкі і ўрады праводзяць такія сур'ёзныя і дарагія мерапрыемствы з мэтай не дапусціць распаўсюджання фінансавага крызісу на іншыя сектары эканомікі.

Адпаведна банкі, якія выдаюць крэдыты і ацэньваюць рызыкі тых ці іншых аперацый, уважліва адсочваюць макраэканамічныя паказчыкі, у прыватнасці, на рынку нерухомасці, на рынку аўтакрэдытавання з улікам тых заяў, якія прагучалі. Адпаведныя ж арганізацыі, якія займаюцца пытаннямі аналізу тэндэнцый на еўрапейскім аўтарынку, звяртаюць увагу на знїжэнне пакупніцкіх ініцыятыў па набыцці новай тэхнікі ў краінах найбуйнейшых вытворцаў аўтатэхнікі — у той жа Германіі, Іспаніі, Францыі. Адпаведна, калі знїжаецца попыт на набыццё новых машын з-за таго, што ўзнікаюць праблемы па фінансаванні аўтавытворцаў, то і банкі больш уважліва ставяцца да такіх пакупак, і, безумоўна, адбіваецца апошняя сітуацыя на рынку ліквіднасці банкаў.

Яшчэ адзін момант. На пэўных сегментах рынку, калі не развіты іншыя інструменты, укладанне ў нерухомасць — дастаткова папулярная і ў апошні час высокадаходная аперацыя. Гэта значыць, цэны на нерухомасць не адпавядаюць рэальнаму кошту гэтых актываў, яны пераацэнены. Крэдытаванне ж выступае адным з асноўных рэсурсных патокаў для набыцця і будаўніцтва жылля ў многіх краінах, у тым ліку і ў нашай рэспубліцы. Таму банкі спрабуюць аканіць магчымыя змяненні на рынку нерухомасці. А з улікам таго, што ці то кватэры, ці то правы на кватэру з'яўляюцца прадметам закладу па крэдытах, гэта значыць забеспячэннем, узнікае пытанне: наколькі забеспячэнне адэкватнае? Плюс да гэтага крызісныя з'явы прымушаюць банкі ўважліва паглядзець на пытанні сваёй ліквіднасці, якасці сваіх актываў, на перспектывы далейшага функцыянавання рынкаў. Вы бачыце, што банкруцтвы альбо знаходзяцца ў цяжкім стане найбуйнейшыя банкі свету. Натуральна, што банкі спрабуюць максімальна засцерагчы сябе ад небяспекі, у тым ліку шляхам павышэння ставак па крэдытах для стварэння адпаведных рэзерваў, якія будуць кампенсаваць стратныя аперацыі. Банкаўскія спецыялісты больш уважліва ставяцца да разгляду пакета дакументаў, робяць больш жорсткае забеспячэнне.

Яшчэ адзін характэрны момант — беларускія банкі праводзяць актыўныя аперацыі высокімі тэмпамі. На 1 кастрычніка актыўныя аперацыі выраслі амаль на 40 працэнтаў, і многія банкі ўжо вычарпалі, у тым ліку, ліміт іх росту, таму што актыўныя аперацыі ўплываюць на тую пасіўную базу, на тыя рэсурсы, якія ім прадастаўляюць мацярынскія структуры, альбо ўнутраны рынак, ці знешні рынак. Цяпер пазычаць на знешнім рынку дастаткова складана, таму пытанне не ў тым, што банкі зварочваюць крэдытаванне, а ў наступным: яны больш уважліва разглядаюць пакеты дакументаў. Сёння кошт крэдыту расце, да таго ж пэўныя крызісныя з'явы пачынаюць праяўляцца ў эканоміках нашых асноўных гандлёвых партнёраў, узнік дадатковы попыт на крэдыты. А дадатковы попыт, між іншым, узнік у вельмі кароткатэрміновы перыяд, і для таго каб яго задаволіць, неабходна вырашыць пытанне рэсурснай базы. Апошняе пытанне вырашаецца цяпер даволі складана. Беларускія банкі з дапамогай тых інструментаў, тых магчымасцяў, што ў іх ёсць, спрабуюць гэта зрабіць. А з улікам таго, што сукупная доля замежных сродкаў у рэсурснай базе айчынных банкаў даволі невялікая (12—14 працэнтаў, а ў сукупным статутным фондзе замежныя інвестары валодаюць прыблізна 22—24 працэнтамі), беларускія банкі маюць неабходныя магчымасці і патэнцыял для таго, каб вырашыць згаданыя пытанні.

— Сяргей Вітальевіч, паводле меркавання некаторых экспертаў, стаўкі па крэдытах будуць павышацца і з лёгкасцю дасягнуць вышыні ў 20 працэнтаў. Наколькі гэта верагодна?

— Зараз дастаткова складана зрабіць нават кароткатэрміновы прагноз, таму што сітуацыя на рынках мяняецца даволі хутка. Цэнтральныя банкі рэгулярна прымаюць — амаль штодзень — глабальныя рашэнні. І як гэтыя глабальныя рашэнні адаб'юцца на кошце рэсурсаў, на кошце крэдытаў, казаць складана. Можна пра нешта весці гутарку ў разрэзе канкрэтнага дня, але гэтая інфармацыя можа састарэць ужо на наступны дзень, у тым ліку, з пункту гледжання павышэння працэнтных ставак. Таму рабіць цяпер прагноз — справа няўдзячная. Дарэчы, адна з сур'ёзных праблем любога крызісу — немагчымасць ажыццяўляць прагнозы, гэта значыць рабіць аналіз нават на кароткатэрміновую перспектыву. Чым сур'ёзней крызіс, тым складаней зрабіць якасны аналіз, альбо прагноз.

— Што б вы маглі параіць людзям, якія акрэдытаваліся ў банках: ці ёсць сэнс датэрмінова вяртаць ужо ўзятыя крэдыты?

— Універсальнай формулы няма. Трэба ўважліва чытаць крэдытны дагавор: ці ёсць у банка права на змяненне працэнтнай стаўкі. А таксама аналізаваць свой баланс — наколькі змяненне стаўкі па крэдыце пад'ёмнае для сям'і. Адназначна сказаць, што патрэбна ісці і пагашаць крэдыты, альбо, наадварот, дзейнічаць па графіку, немагчыма: гэта разглядаецца кожным індывідуальна. І рабіць гэта, паўтаруся, неабходна з улікам крэдытаздольнасці атрымальніка крэдыту і тых змяненняў, якія, магчыма, будуць унесены ў працэнтную стаўку па крэдытным дагаворы.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

«ТЭТА» «АДМЫВАЛА» МІЛЬЯРДАМІ

Аферысты пералічылі за межы Беларусі не менш за 12 мільярдаў рублёў

Адказныя асобы УП «Тэта», заснавальнікам якога з'яўляецца Мінская гарадская арганізацыя «Грамадскае аб'яднанне «Беларускае таварыства інвалідаў», на працягу 2004—2007 гадоў у змове з іншымі саўдзельнікамі займаліся крадзяжом і легалізацыяй грашовых сродкаў шэрагу прадпрыемстваў рэспублікі. Да такіх высноў прыйшлі супрацоўнікі Галоўнага следчага ўпраўлення папярэдняга расследавання МУС, якімі завершана расследаванне па гэтай справе.

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, устаноўлена, што «Тэта» ў многіх здзелках выконвала ролю «фінансавай кампаніі» для адмывання грашовых сродкаў «пад маркай» выканання розных работ і паслуг, якія насамрэч прадпрыемствам не выконваліся. Прайдзісветы, скарыстаўшыся гэтай схемай, пералічылі за межы рэспублікі на рахункі падкантрольных суб'ектаў гаспадарання ў Літве, Латвіі і Расіі не менш за 12 мільярдаў рублёў, дзе было «адмыта» каля пяці з іх. У праваахоўнікаў маюцца доказы таго, што на адрас «Тэты» неправамерна пералічвалі грашовыя сродкі такія арганізацыі, як РУП «ВА Беларускалій» і ААТ «Белгархімпрам» — за выраб праектнакаштарыснай дакументацыі для руднікоў, «Рэдакцыя «Настаўніцкай газеты» — за выкананне выдавецкай падрыхтоўкі газет, «НДІ статыстыкі і аналізу» — за стварэнне навукова-тэхнічнай прадукцыі.

Як удакладняюць у міністэрстве, да крымінальнай адказнасці прыцягнуты восем чалавек. Праўда, трое з іх зніклі ад следства і аб'яўлены ў вышук. Яшчэ адна саўдзельніца была затрымана ў Балгарыі і цяпер вырашаецца пытанне аб экстрадыцыі. А яшчэ пяцярым фігурантам гэтай справы прыйдзецца трымаць адказ перад судом — дырэктару прадпрыемства, двум яго намеснікам, галоўнаму рэдактару «Настаўніцкай газеты» і яго сыну.

Ігар ГРЫШЫН.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.10.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 114,00
1 еўра	2 842,27
1 латвійскі лат	4 008,72
1 літоўскі літ	823,18
1 чэшская крона	113,39
1 польскі злоты	796,26
1 расійскі рубель	80,53
1 украінская грыўня	401,90

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	26,2505
10 UAH	49,9059
1000 BYR	12,4204
EUR	35,3988

Курс у гандлёвых кампаніях (на 17.10.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже изолированного нежилого помещения (торговое помещение) с инвентарным номером 500/D-1000426 общей площадью 65,1 кв. м, расположенного по адресу: г. Минск, проспект Независимости, 40.

Начальная цена – 1 240 000 000 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка и платы за участие в аукционе в размере 4 базовых величин; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 124 000 000 белорусских рублей и плата за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона заключается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 10 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. Аукцион состоится **18 ноября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **17 ноября 2008 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

УНП 190398583

ООО «Кубок» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже имущества *завода по производству блоков из пено- и газобетона* в составе *зданий:* здание главного производственного корпуса (об. пл. 3401,0 кв.м), административно-хозяйственное здание (об. пл. 886,0 кв.м), здание весовой (об. пл. 26,0 кв.м), здание контрольно-пропускного пункта (об. пл. 10,0 кв.м); *сооружений:* склад цемента силосного типа из трех емкостей, объемом 819 м^3, вместимостью цемента 900 тн, пропарочные камеры (220 кв.м), открытый склад (679,8 кв.м), внутризаводские площадки, дороги (4900,7 кв.м), ж/б ограждение (протяженность 363,44 м.п., высота 2,05 м), кабельные линии (электрические сети, протяженность 94,11 м), внутриплощадочные водопроводные сети (протяженность 382,69 м), наружное освещение (ж/б опоры РКУ-250, 7 элементов), внутриплощадочные электрические сети (ж/б опора), внутриплощадочные тепловые сети (протяженность 397,05 м), внутриплощадочные канализационные сети (вид: канализация для сброса технической и питьевой воды, протяженность 385,60 м), а также оборудования (согласно перечня), расположенного по адресу: Могилевская область, Осиповичский район, г. Осиповичи, ул. Проектируемая, 8. По территории завода проходит ж/д ветка. *Начальная цена с НДС – 4 938 300 000 бел. руб. Площадь земельных участков – 1,9529 га; 0,0516 га.* Задаток в сумме 100 000 000 бел. рублей перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Объект продается без условий. Порядок проведения аукциона и перечень оборудования оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **18.11.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321 Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.11.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by

УНП 690324015

ОАО «Минскконтракт» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона)

ПОВТОРНО ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже зданий, сооружений и иного имущества, расположенного на ул. Смоленской, 51 в г. Минске, единым лотом.

В состав лота входит следующее имущество:

№ п/п	Наименование объектов	Инв. №
1.	Административное здание (общая площадь – 162,5 кв.м)	565
2	Здание склада (общая площадь – 362,9 кв. м)	567
3	Здание склада (общая площадь – 858,3 кв. м)	568
4	Здание склада (общая площадь – 193,7 кв. м)	569
5	Здание склада (общая площадь – 731,5 кв. м)	570
6	Здание бытового назначения (общая площадь – 96,1 кв. м)	571
7	Открытая площадка (площадь – 0,9 га)	572
8	Навес (общая площадь – 182 кв. м)	573
9	Водопровод наружный (длина – 230 м)	574
10	Наружное освещение	941
11	Ограждение железобетонное внешнее с воротами	942
12	Канализация бытовая (длина – 14 м)	943
13	Насаждения	944
14	Водосчетчик Bip-M	212
15	Прибор учета тепла ФС-31М1	1

Площадь земельного участка – 1,2031 га, кадастровый номер 500000000001001893. Отвод земельного участка будет производиться Минской городской землеустроительной и геодезической службой.

Начальная цена лота – 4 123 956 300 белорусских рублей без учета НДС.

Продаваемое имущество обременено договорами аренды.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка и платы за участие в аукционе в размере 4 базовых величин; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 400 000 000 белорусских рублей и плата за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится 03 ноября 2008 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 31 октября 2008 года до 16.45 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

УНП 190398583

Прэзідэнт Беларусі зацвердзіў Дзяржаўную інвестыцыйную праграму на 2009 год

Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Праграмай з улікам сродкаў рэзервовага фонду Прэзідэнта ў 2009 годзе плануецца накіраваць Br2637,6 млрд на будаўніцтва 669 аб'ектаў (з іх 243 — новапачатыя), з якіх будзе ўведзена ў эксплуатацыю 310 (уключаючы пускавыя комплексы). З рэспубліканскага бюджэту на фінансаванне праграмы будуць накіраваны сродкі ў суме Br2074,4 млрд.

Для фінансавання ў 2009 годзе завяршэння будаўніцтва першага і пачатку другога этапа будаўніцтва ўстаноўкі па апрацоўцы цвёрдых бытавых адходаў, глею і асадкаў сцёкавых вод у Брэсце праграмай прадугледжана выкарыстоўваць сродкі рэзервовага фонду Прэзідэнта Беларусі ў памеры Br110,2 млрд. Акрамя таго, плануецца накіраваць з дзяржаўнага мэтавага бюджэтнага фонду нацыянальнага развіцця Br453 млрд на будаўніцтва капіталаёмістых аб'ектаў, якія маюць агульнадзяржаўнае значэнне, такіх як шматпрофільны культурна-спартыўны комплекс «Мінск-Арэна» (Br245,6 млрд), атамная электрастанцыя (Br172,4 млрд), а таксама на рэканструкцыю вытворчасці інфузійных растворaў рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў» (Br5 млрд). У цэлым рэалізацыя праграмы дасць магчымасць забяспечыць увод у эксплуатацыю ў 2009 годзе інтэрната Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на 1030 месцаў па пр. Дзяржынскага ў Мінску, пашырэння прадпрыемства «Віцебская біяфабрыка», крытага манежа са стайняй у пас. Ратамка Мінскага раёна, першага этапа будаўніцтва ўстаноўкі па апрацоўцы адходаў, глею і асадкаў у Брэсце, лядовых палацаў і іншых аб'ектаў. Будзе завершана рэканструкцыя трэцяга пускавога комплексу Нацыянальнага тэатра оперы і балета ў Мінску, 8-га і 9-га карпусоў Рэспубліканскага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак на базе 9-й гарадской клінічнай бальніцы, другой і трэцяй чэргаў РНПЦ «Маці і дзіця», навучальнага корпуса Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова, стадыёна з канкурным і выездкавым палямі ў пас. Ратамка Мінскага раёна...

Плануецца прадоўжыць будаўніцтва гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж», замкавага комплексу ў г.п. Мір, РНПЦ «Маці і дзіця» ў Баранавічах, корпуса Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, рэканструкцыю аб'ектаў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, лячэбна-дыягнастычнага корпуса і аперацыйна-рэанімацыйнага блока дзяржаўнай установы «Рэспубліканскі клінічны медыцынскі цэнтр», лядовых арэн у Ваўкавыску і Слоніме, вучэбна-педагагічнага комплексу ў пас. Лясным Мінскага раёна і іншых аб'ектаў, пачаць будаўніцтва школ у Мазыры, Глыбокім, Гродне, Рагачове і іншых аб'ектаў.

Гандаль неахвотна бярэ айчынныя сокі

Аб гэтым заявіў на пасяджэнні калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю старшыня КДК Зянон Ломаць.

Ён адзначыў, што ў рэспубліцы сокі і сокавую прадукцыю вырабляюць 50 арганізацый. Яшчэ два прадпрыемствы вырабляюць сокі на давальніцкіх умовах, выкарыстоўваючы магутнасці беларускіх кансервавых заводаў. Аналіз паказвае, што айчынныя вытворцы могуць поўнасцю задаволіць патрэбнасць унутранага рынку, якая складае 100—120 тыс. тон у год. Беларускія прадпрыемствы гатовы ў год вырабляць звыш 350 млн умоўных слоікаў сокаў, або каля 140 тыс. тон.

Разам з тым імпартныя сокі займаюць больш як 50 працэнтаў айчыннага рынку. І гэта пры тым, што беларускі сок, як правіла, значна танейшы за імпартны. У сувязі з гэтым КДК мае намер узяць пад строгі кантроль імпарт сокаў. Экспансію імпартных сокаў у Беларусі неабходна спыніць, падкрэсліў Зянон Ломаць. Ён назваў «партызаншчынай» імкненне некаторых пастаўшчыкоў імпартных сокаў аплачваць гандлёвым прадпрыемствам так званыя маркетынгавыя паслугі. Размова ідзе аб размяшчэнні тавару ў лепшых месцах гандлёвай залы, на бачным месцы. Праверкі паказалі, што сума такіх паслуг па заключаных дагаворах дасягае 10 працэнтаў ад абароту прадукцыі. Разам з тым старшыня КДК раскрытыкаваў і айчынных вытворцаў сокаў, якая часта не імкнуцца папулярызаваць сваю прадукцыю на рынку, не працуюць з рэкламай. «Яны спяць і нічога не робяць, чакаюць, што мы створым ім умовы. Гэтак таксама нікуды не варта. Самі ездзьце ў супермаркеты і магазіны, прапануйце сваю прадукцыю, рэкламуйце яе», — сказаў Зянон Ломаць.

БЕЛТА.

ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «БЕЛГОРХИМПРОМ»!

ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ

состоится 24 октября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17 в актовом зале.

Повестка дня:

1. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Белгорхимпром».

Регистрация акционеров в день проведения собрания с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17 в актовом зале (3 этаж).

УНП 600024712

Прамая лінія

Максім ЕРМАЛОВІЧ:

«Адзіная стаўка падаходнага падатку не прывядзе да росту падатковага цяжару ні на адну катэгорыю плацельшчыкаў»

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 17 кастрычніка.)

— Ці пралічвалі спецыялісты наступны момант: ад новаўвядзення бюджэт выйграе ці, наадварот, прайграе?

— У наступным годзе бюджэт панясе страты, таму што мы рэальна зніжаем падатковы цяжар. Нельга чакаць адначасовага павелічэння даходаў бюджэту ў выніку змянення падыходаў да прымянення ставак падаходнага падатку.

— Затое бюджэт кожнай сям'і можа ад гэтага выйграць.

— Так. Мы разлічваем, што каля 600 мільярдаў рублёў з улікам павышэння зарплаты ў выніку такой меры застанецца спажыўцам.

— Значная частка даходаў бюджэту ідзе на выплату зарплаты, пенсій, стыпендый. А ці можна сказаць, што гэта таксама і бюджэт развіцця, што грошы ідуць і на фінансаванне важнейшых нацыянальных прыярытэтаў?

— Сапраўды, бюджэт сацыяльнанакіраваны, расходы на ахову здароўя, адукацыю, культуру, спорт, сацыяльную палітыку ўзрастаюць на 35 працэнтаў пры агульным росце расходаў на 26 працэнтаў, гэта значыць, тут адзначаецца апераджальны рост расходаў сацыяльнага блока. Але, акрамя таго, значныя сродкі закладваюцца на рэалізацыю дзяржпраграм і нацыянальных прыярытэтаў. У першую чаргу, гэта датычыцца дзяржаўнай падтрымкі насельніцтва адрасной сацыяльнай дапамогай і безнаяўных жыллёвых субсідый. Таксама значны рост расходаў прадугледжваецца на падтрымку рэгіёнаў, што пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС. Усе расходы на гэтыя мерапрыемствы ўзрастуць у бюджэце наступнага года ў параўнанні з сёлетнім на 43 працэнты. Значныя расходы прадугледжваюцца на падтрымку жыллёвага будаўніцтва. Тую задачу, якую паставіў кіраўнік дзяржавы па ўводзе 6 мільёнаў квадратных метраў жылля ў 2009 годзе, мы павінны рэалізаваць і накіроўваем каля 2 трыльёнаў рублёў бюджэтных сродкаў: гэта фінансавая дапамога, аднаразовыя безнаяўныя субсідыі, кампенсацыя банкаўскіх працэнтаў па крэдытах на жыллёвае будаўніцтва, стварэнне інжынерна-транспартай інфраструктуры да новага жылля.

— У нас вялікія грошы выдзяляюцца на падтрымку вёскі, забеспячэнне харчовай бяспекі. У гэтай справе мы працягваем захоўваць прыярытэты?

— На фінансаванне АПК у наступным годзе будзе накіравана 4,5 трыльёна рублёў. Гэта значна большыя рэсурсы, чым мы выкарыстоўваем сёлета, таму што харчовая бяспека — вельмі актуальная задача ва ўмовах змянення кан'юнктуры цэнаў на харчаванне на сусветным рынку.

— Налета прадугледжваецца дэфіцыт бюджэту. Наогул, калі размова ідзе пра дэфіцыт бюджэту, у многіх узнікае сумненне: калі ёсць дэфіцыт, значыць, мы нібыта жывём не па сродках?

— Гэта не так. Большасць дзяржаў у свеце фарміруюць свае бюджэты з дэфіцытам. І гэта цалкам нармальная практыка: галоўнае, каб узровень гэтага дэфіцыту не перарастаў эканамічна бяспечнага парогу. Парог сусветнай эканамічнай тэорыі складае 3 працэнты да ВУП. Калі дэфіцыт бюджэту дзяржавы не пераходзіць гэтага парога, то дэфіцыт лічыцца эканамічна апраўданым, забяспечаным крыніцамі. У нас на будучы год плануецца дэфіцыт бюджэту 1,8 працэнта да ВУП, гэта значыць, на ўзроўні вельмі далёкім ад парогавага значэння.

— Тым больш што сёлета бюджэт выконваецца з прафіцытам.

— Так, мы выконваем бюджэт гэтага года з апераджэннем, але гэта вынік дастаткова высокіх тэмпаў эканамічнага росту, якія пераўзыходзяць параметры, закладзеныя пры фарміраванні бюджэту на гэты год. Мы заўсёды асцярожна падыходзім да фарміравання даходнай часткі бюджэту, улічваючы параметры сацыяльна-эканамічнага развіцця, ніколі не плануем паказчыкі па максімальным іх значэнні.

— Вяртаючыся да падаходнага падатку: хто зможа скарыстацца вылікам у 250 тысяч рублёў?

— Ім змогуць скарыстацца толькі тыя, у каго сярэднямесячны даход не перавышае 1 мільёна 500 тысяч рублёў.

— Гэта значыць, калі чалавек зарабляе, напрыклад, 1 мільён 600 тысяч рублёў, ён не зможа скарыстацца вылікам?

— Так, ён гэтым вылікам скарыстацца не зможа. Але, тым не менш, калі б гэты чалавек плаціў падатак па той сістэме, якая дзейнічае сёння, ён бы выплаціў больш, чым з улікам 12-працэнтнай стаўкі.

— Максім Леанідавіч, якая лічба ў бюджэце вас найбольш парадавала?

— Мабыць, сам аб'ём бюджэту. Эканоміка расце, ВУП павялічваецца і кансалідаваны бюджэт у наступным годзе складзе больш за 70 трыльёнаў рублёў, гэта амаль 35 мільярдаў долараў ЗША. Гэта значны аб'ём і сведчыць аб паляпшэнні ўзроўню жыцця ў краіне.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Сёлета камунальныя тарыфы павышацца не будуць

Калі плацяжы за кватэру перавышаюць пэўны ўзровень даходаў сям'і, прызначаецца безнаяўная жыллёвая субсідыя. Прычым для гарадскіх жыхароў гэты паказчык складае 20 працэнтаў, а для вяскоўцаў — 15. Чалавек прадастаўляе даведку аб складзе сям'і і даходах, рашэнне аб прызначэнні дапамогі прымае выканкам. У асноўным на тры месяцы, аднак, паведаміла **начальнік управлення эканомікі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Алена ДУДЗІНСКАЯ,** у асобных выпадках субсідыі прызначаюцца на тэрмін да года.

Летась безнаяўныя жыллёвыя субсідыі ў Беларусі атрымалі каля 77 тысяч сем'яў. Агульны фонд выплат склаў 2,2 млрд рублёў, сярэдняя сума субсідыі — 31 тыс. рублёў. Сёлета за студзень — жнівень безнаяўныя жыллёвыя субсідыі ўжо атрымалі амаль 47 тыс. сем'яў. Выплаты склалі 1,8 млрд рублёў, што на 260 млн рублёў менш, чым за такі ж перыяд мінулага года. А вось колькасць атрымальнікаў зменшылася на 5,3 тыс. сем'яў. Сярэдняя сума субсідыі складае ад 28 тыс. рублёў (у сталіцы) да 41 тыс. рублёў (у Брэсцкай вобласці). Як заўважыла Алена Дудзінская, сярод катэгорый атрымальнікаў каля трэці агульнай колькасці прыпадае на нязводныя і шматдзетныя сем'і, 20 працэнтаў — гэта адзінокія грамадзяне, 15 — пенсіянеры. Паводле слоў спецыяліста, сям'я з двума дзецьмі, якая жыве ў трохпакаёвай кватэры і мае сукупны даход менш чым 840 тысяч рублёў, можа прэтэндаваць на субсідыю. Для адзінокага жыхара аднапакаёўкі гэтая лічба складае каля 200 тыс. рублёў.

Але трэба мець на ўвазе і тое, што субсідыя прызначаецца толькі ў адпаведнасці з нарматывамі спажывання той ці іншай камунальнай паслугі. Да прыкладу, норма па вадзе (у кватэрах з цэнтралізаваным водазабеспячэннем) складае 230 літраў у суткі на чалавека, цяплу — 0,026 Гкал на 1 кв. метр (у межах 20 кв. метраў на чалавека), электрычнасці — 720 кілават-гадзін у год у дамах з электраплітамі, і 360 Квт/гадз. у іншых выпадках.

Павелічэнне тарыфаў хоць і адбываецца разам з ростам даходаў насельніцтва, аднак для асобных катэгорый б'е па кішэні. Сёлета камунальнікі не здолелі ўтрымацца на 5-доларавай мяжы павышэння расцэнак на паслугі. Агульны рост ужо цяпер склаў 9,1 долара: 5 долараў пасля студзеньскага павелічэння тарыфаў і 4,1 долара — пасля майскага «рыўка». Калі летась у кастрычніку двухпакаёўка «пацягнула» на 122 тыс. рублёў, то цяпер — ужо на 141 тыс. Як заўважыла Алена Дудзінская, **падчас ацяпляльнага сезона разлікі за набор паслуг для стандартнай аднапакаёвай кватэры агульнай плошчай 32 кв. метры, дзе пражываюць два чалавекі, складзе 94,6 тыс. рублёў (у летні перыяд — 61,9 тыс.). За двухпакаёўку (48 кв. м, тры чалавекі) трэба вылажыць 141,8 (92,8) тыс. рублёў, трохпакаёўку (69 кв. м, 4 чалавекі) — 196,9 (126,3) тыс. руб. Як бачым, для асобных жыхароў разлікі ўжо ўшчыльную наблізіліся да 100-доларавай мяжы. Гэта па самых прыблізных разліках, а калі мець на ўвазе розныя «накруткі» (кшталту звышнарматыўнай плошчы), то выходзіць і больш.**

Тым не менш, паведаміла Алена Дудзінская, нават пасля двух сёлетніх павышэнняў у сярэднім насельніцтва вяртае толькі крыху больш, чым 30 працэнтаў затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг. Прычым гэты стратэгічны для камунальнай галіны паказчык практычна не змяніўся ў параўнанні з такім жа перыядам летась. Аднак **павышэння тарыфаў да канца года не прадбачыцца — запэўніла спецыяліст Мінжылкамунгаса ў адказ на пытанне карэспандэнта «Звязды».** Якой будзе тарыфная палітыка налета, зараз казаць даволі складана, паколькі не вызначаны кошт на пастаўкі прыроднага газу. Пэўныя разлікі павелічэння «кватэрных» плацяжоў ужо вядуцца, заўважыла Алена Дудзінская, але агучваць канкрэтныя лічбы пакуль заўчасна.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Работа над праектам Канстытуцыйнага акта Саюзнай дзяржавы завершана

паведаміў карэспандэнту БЕЛТА старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Вадзім Папоў.

«Беларуска-расійская рабочая група па падрыхтоўцы праекта Канстытуцыйнага акта Саюзнай дзяржавы поўнасцю завяршыла ўзгадненне гэтага дакумента, — сказаў ён. — Праект перададзены ў Вышэйшы Дзяржсавет Саюзнай дзяржавы». Ён не выключыў, што праект Канстытуцыйнага акта можа быць разгледжаны на бліжэйшым пасяджэнні Вышэйшага Дзяржсавета.

Абзац

■ ДАІ АДШУКВАЕ ВАДЗІЦЕЛЯ, ЯКІ ЎЦЁК З МЕСЦА ДТЗ. 15 кастрычніка каля 14 гадзін 30 хвілін на вуліцы Прытыцкага насупраць дома № 78 у Мінску аўтамабіль «БМВ-525» серабрыстага колеру, рэгістрацыйны знак 6997IP-7, збіў дзевяцігадовага хлопчыка. Дзіця з цяжкімі траўмамі даставілі ў рэанімацыю Бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі. Усіх, хто быў сведкам гэтага ДТЗ або мае звесткі аб месцазнаходжанні ўказанага аўтамабіля і вадзіцеля, супрацоўнікі ДАІ просяць патэлефанаваць па нумарах 222 17 17, 222 08 29, 222 08 48, 222 25 05.

■ Цэны на харчовыя тавары ў Беларусі сёлета ў студзені — верасні выраслі на 9,5 працэнта ў адносінах да снежня мінулага года.

■ У Мінску адзначаецца рост колькасці пацярпелых ад атручэння грыбамі — сёлета па дапамогу да медыкаў звярнуліся 152 чалавекі супраць 92 летась. Для адной 60-гадовай мінчанкі такая трапеза закончылася смерцю.

■ Новым галоўным нарколагам Міністэрства аховы здароўя Беларусі назначаны Аляксей Аляксандраў — кандыдат медыцынскіх навук, раней працаваў асістэнтам кафедры Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі.

■ У Эстоніі на 53-м годзе жыцця памёр пасля працяглай хваробы вядомы тэлежурналіст і вядучы Урмас От. Летам штотыднёвік «Eesti Ekspress» пісаў, што для яго шукалі донара для перасадкі касцявога мозгу. Такую аперацыю робяць пры комплексным лячэнні раку.

■ Учора раніцай у Чыцінскай вобласці разбіўся выпрабавальнік МіГ-29. Пілот катапультаваўся, ахвяраў і разбурэнняў на месцы падзення самалёта няма.

■ У Нагорным Карабаху прайшло адначасовае шлюбаванне сямі соцень пар. Калектыўнае вянчанне прайшло ў двух храмах — царкве Хрыста Збавіцеля XIX ст. у горадзе Шушы і ў старажытным манастыры Гандзасар XIII ст. Пасля гэтага пары афармілі шлюб па грамадзянскіх законах на стадыёне Сцепанакерта.

■ Партыя ювелірных вырабаў без дзяржаўных прабірных клеймаў канфіскавана ў жыхаркі Віцебска. Гэта больш за 100 вырабаў з серабра і золата з устаўкамі з каштоўных камянёў агульнай вагой 410 г і коштам больш за Br25 млн.

■ У чацвер жыхар Томска вярнуў аднаму з філіялаў буйнога расійскага банка каля чатырох мільярдаў рублёў, якія памылкова былі залічаныя на яго банкаўскую картку. Гэты незвычайны выпадак адбыўся з супрацоўнікам праваахоўных органаў горада. «Мне проста паціснулі руку, сказалі: бывайце!», адказаў ён на пытанне пра ўдзячнасць з боку банка. Банк таксама вялікі прасіў не афішаваць гэты выпадак.

■ Жыхар Коста-Рыкі не змог атрымаць выйгрыш па памытым разам са штанамі латарэйным білеце. Угадаўшы патрэбныя лічбы, ён выйграў другі прыз у памеры 112 тыс. долараў. Аднак кавалачкі білета ён выявіў у кішэні памытых напярэдадні штаноў. Арганізатары адмовіліся выплачваць выйгрыш, не дапамог яму і суд, што закончыўся днямі.

Поўны абзац

■ Незвычайную аперацыю давялося правесці на днях брытанскім выратавальнікам, якіх выклікалі на дапамогу п'янаму поні. Жывёліна аб'елася падгнілых яблыкаў, ап'янела і незнарок укінулася ў басейн. Як вядома, на некаторых жывёлін браджэнне, што ўзнікае ў падгнілай садавіне, дзейнічае як алкаголь на чалавека. Гэта і здарылася з поні, які з'еў каля сотні пладоў. Хістаючыся, ён дайшоў да басейна, каб папіць, аднак не ўтрымаўся на нагах і бултыхнуўся ў ваду. Ад гэтага прачнулася гаспадыня і выклікала выратавальнікаў, бо сама не змагла выправіць сітуацыю. Брыгада выратавальнікаў і паліцэйскія дзве гадзіны цягнулі поні з вады, аднак дабіліся поспеху толькі пад раніцу, калі жывёліна працверазела ад водных працэдур.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

РУП «Белспецконтракт» проводит 12-й открытый аукцион по продаже объектов республиканской собственности 21 ноября 2008 года.

№ п/п	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч	Начальная цена продажи объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
1.	Грузовой КАМАЗ-4310 ш. 0058463, дв. 44445	войсковая часть 06752 г. Минск в/г Мачулищи	1989	99537	14 000 000	1 400 000
2.	Грузовой Урал-4320 ш. 064550, дв. 982681	войсковая часть 48668 г. Ст. Дороги	1986	83679	10 000 000	1 000 000
3.	Грузовой КрАЗ-255Б1 ш. МО712363, дв. 650545	войсковая часть 48668 г. Ст. Дороги	1991	37552	19 100 000	1 910 000
4.	Грузовой Урал-4320-0011-01, ш. 012055, дв. 384996	ЧУП Лунинецкая автошкола ДОСААФ г. Лунинец	1982	103559	9 000 000	900 000
5.	Грузовой КАМАЗ-43106 ш. 0006916, дв. 0783883	войсковая часть 48668 г. Ст. Дороги	1991	102994	12 000 000	1 200 000

12-й аукцион состоится в **11.00 21 ноября 2008 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, РУП «Белспецконтракт».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в **17.00 19 ноября 2008 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца. 2, комн. 604, РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 21 ноября 2008 года.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней от дня подписания договора купли-продажи.

Денежные средства перечисляют на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отд. ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС.**

Справки по тел.: (017)тел./факс 224 88 05, 224 54 15.
Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com

УНП 101099370

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ,

с установлением начальной цены продажи неиспользуемого имущества, равной одной базовой величине

Аукцион состоится: 28 ноября 2008 г. в 15.00.

Место проведения аукциона: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

Продавец: Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», 220050, г. Минск, пр-т Ф. Скорины, 10, тел. 8(017) 226 01 73, 226 11 70.

Заявления принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104. Последний день подачи заявлений 26 ноября 2008 г. до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона 28 ноября 2008 г. с 14.00 до 14.50.

Контактные телефоны организатора аукциона: 31 11 85, 31 12 16.

Предмет аукциона: лот № 1– Неиспользуемое изолированное помещение отделения связи площадью 127,2 кв.м. Объект занимает часть второго этажа – 97,01 кв.м, лестничные клетки первого этажа – 16,26 кв.м и второго этажа – 13,93 кв.м. Фундамент изолированного помещения из бетонированных блоков, стены кирпичные, перекрытия – ж/б плиты, полы деревянные, тип кровли – совмещенная, мягкая рулонная. Объект расположен по адресу: Могилевская область, Дрибинский район, д. Белая.

Объект расположен на земельном участке 0,0600 га, находящемся на праве постоянного пользования за продавцом на основании решения Дрибинского районного исполнительного комитета. Окончательное решение об отводе земли для обслуживания изолированного помещения принимается Дрибинским райисполкомом.

Цена продажи объекта: **35 000** руб.

Сумма задатка **3 500** руб.

Условия продажи объекта:

1. Осуществление предпринимательской деятельности на объекте недвижимости и создание рабочих мест.

2. Запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта недвижимости до выполнения им условий договора купли-продажи.

К участию в аукционе допускаются негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в фонд «Могилевоблимущество»:

заявление на участие в аукционе;

заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение задатка на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 Могилевского областного управления ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050, ОКПО 28319105;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

юридическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

юридическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

представителями юридических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

Представители юридических лиц и индивидуальных предпринимателей предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Срок заключения (государственной регистрации) договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата за объект осуществляется денежными средствами по безналичному расчету. Условия оплаты – разовый платеж.

Участники аукциона возмещают фактические затраты на подготовку и проведение аукциона.

Калі...

Калі стане цёпла ў кватэрах?

«Стартануў» ацяпляльны сезон — у адпаведнасці са спецыяльным распараджэннем Мінскага гарвыканкама батарэі пачалі падключаць у школах, дзіцячых садках, лячэбных установах. Астатнія групы спажыўцоў пакуль на чарзе.

На думку спецыялістаў, пакуль канчаткова не вытрыманы адпаведны нарматыў пачатку ацяпляльнага сезона. Як вядома, батарэі ў жылых дамах «адтаюць» толькі ў тым выпадку, калі на працягу пяці дзён сярэднясутачная тэмпература паветра на двары не перавышае 8 градусаў. Камунальнікі ўзгадняюць свае далейшыя дзеянні з сіноптыкамі, якія рыхтуюць доўгатэрміновы прагноз надвор'я. Здаецца, чакаць прыходу цяпла жыхарам засталося нядоўга. Прынамсі, мінчанам: як заўважыў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» намеснік генеральнага дырэктара па эксплуатацыі галоўнага вытворчага ўпраўлення «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Сяргей Пушкоў, магчыма, што падключэнне ацяплення ў жылых дамах сталіцы (у тым выпадку, калі будзе падпісана адпаведнае распараджэнне Мінгарвыканкама) пачнецца ўжо з панядзелка. Паколькі жылфонд у сталіцы вялікі, то батарэі будуць падключаць па графіку на працягу пяці дзён. У хуткім часе пацяплець павінна і ў кватэрах жыхароў іншых рэгіёнаў — Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ўзгодніла пачатак ацяпляльнага сезона пасля дасягнення нарматыўнай тэмпературы паветра.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Калі пенсіі не хапае

У свой час гэтага жыхара Брэста ўжо судзілі за незаконныя здзелкі з каштоўнымі металамі і камянямі. Але пенсіянеру зноў захацелася лёгкага хлеба і ён у гасцініцы «Інтурыст» збыў беспрацоўнаму мінчаніну 7 фальшывых 100-доларавых купюр, якія вырабіў сам. Здзелка праходзіла пад узаемнай згодзе, бо абое ведалі, што долары падробленыя. Узбуджана крымінальная справа.

Калі не спіцца ноччу

У Брэсцкую бальніцу даставілі 25-гадовага мужчыну з нажавым раненнем жывата.

Аператыўнікі наведалі кватэру па вул. Карбышава, дзе пражываў паранены і высветлілі, што ў 3 гадзіны ночы тут успыхнуў скандал. Апошняе слова было за жонкай, якая схапіла кухонны нож і ўдарыла мужа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Калі за рулём прафесіяналы

Рэспубліканскія фінальныя спаборніцтвы па прафесійным майстэрстве вадзіцеляў аўтамабільных транспартных сродкаў праходзілі 16 кастрычніка ў Салігорску на базе Салігорскай аўтабазы ААТ «Водбудаўтатранс» са Старобіна пры падтрымцы Міністэрства транспарту і камунікацый сумесна з галіновым прафсаюзам і ДТСААФ.

Як паведаміў **галоўны суддзя спаборніцтваў Міхаіл СВІСТУН,** «падобныя мерапрыемствы, пачынаючы з 2001 года, праводзяцца ўжо штогод. Ды і ўзровень майстэрства вадзіцеляў за гэты час значна павысіўся. Кожная з фігур, якую трэба выканаць, паўтарае сітуацыю на дарозе. Самая цяжкая фігура — бакавая паркоўка: вадзіцель заднім ходам машыны павінен прыпаркаваць аўто ў пэўным перыметры дадзенай фігуры».

Практычная частка ўключае ў сябе праверку кіравання транспартнымі сродкамі МАЗ-103, МАЗ-5551, МАЗ-5432, ГАЗ-3221, ГАЗ-3110. Абавязкова павінен быць адзін малады вадзіцель — не старэй за 26 гадоў. Гэта — адна з галоўных умоў конкурсу. Удзельнікі ж каманды-пераможцы ў падарунак атрымаюць ЖК-тэлевізары.

Намеснік міністра транспарту і камунікацый Іван ШЧЭРБА адзначыў: «Мы спадзяёмся, што гэта паслужыць папулярызацыі прафесіі вадзіцеля. З кожным годам удзельнікаў становіцца ўсё больш. Гэты конкурс — не проста рэспубліканскія спаборніцтвы, гэта вельмі вялікі працяглы працэс — усё пачынаецца ад раёнаў і абласцей. Сёлета мы падрыхтавалі добрыя прызы для пераможцаў. А ўвогуле мы заклікаем да ўдзелу ўсіх: не толькі абласныя аб'яднанні, але і канкрэтныя прадпрыемствы. Не толькі сістэмы Міністэрства транспарту, але і любой формы ўласнасці: і Міністэрства прамысловасці, сельгаскарчу і іншых міністэрстваў».

Ілья ЛАПАТО. Фота аўтара.
Салігорск—Мінск.

Калі старасць у радасць

Клубу «У гасцях у бабуль» Маскоўскага раёна Мінска споўнілася 10 гадоў

Песні і танцы, вершы і жвавыя гутаркі. Адразу нават і не верыш, што самай маладой з гэтых жанчын 60 гадоў. Нягледзячы на свой узрост, яны збіраюцца разам на кожнае свята, клубам ходзяць у тэатры і наведваюць музеі, арганізоўваюць карнавалы і выставы. «Займаем актыўную жыццёвую пазіцыю», — кажа 87-гадовая Глафіра Самойлаўна.

Першы збор клуба былая старшыня Ніна Аляксееўна Афанасьева памятае вельмі добра:

— Набралася, дзякуй Богу, нас вельмі шмат, настаўнікі 12-й гімназіі, таварыства чарнобыльцаў. У нас была мэта — сувязь маладога пакалення са старэйшым, удзельнікамі вайны. Гэта было на 8 Сакавіка. Мы зрабілі сцэнарый. Дзеткі прыйшлі нас павіншаваць, знаходзілі ў бабуль шмат вартасцяў.

Што мне запомнілася — тады надарылася вельмі снежная вясна. І мы ішлі праводзіць Лідзію Васільеўну. Па дарозе была кветкавая крама, я ў яе зайшла і расказала пра наша свята, пра тое, хто ў нашым клубе. Уладальніца адгукнулася на просьбу, і далей мы ішлі з букетамі вясновых кветак.

Дзякуй трэба сказаць цэнтру сацыяльнага абслугоўвання, што пра нас не забываюцца. Калі раней мы да іх прыходзілі і штурхалі, то цяпер яны самі праяўляюць увагу да нас.

З цікавых мерапрыемстваў бабулі ўспамінаюць пра наведванне Нацыянальнай бібліятэкі, краязнаўчага музея, лініі Сталіна і Жыровіцкага манастыра. А таксама выставу «З бабулінага куфра», дзе можна было ўбачыць вышываніку, рэчы, фартухі і іншае, зробленае іх рукамі. Раз у месяц-паўтара цэнтр сацыяльнай абароны арганізоўвае для іх лекцыі па псіхалогіі, садоўніцтву і г.д.

Цяпер у клубе 34 жанчыны. У кожнай свой лёс і свае перажыванні.

У 87 гадоў былая настаўніца рускай і беларускай мовы Глафіра Самойлаўна Шкуран запісана ва ўсе бібліятэкі горада. Ні дня без прачытанага радка — гэта пра яе. Яна рэгулярна наведвае тэатры. Асабліва даспадобы прыйшлася п'еса Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта», якую яна глядзела ў Купалаўскім. Чытае і сучасную літаратуру, з паэзіі падабаецца Віктар Шніп, а з прозы — Уладзімір Ліпскі.

— Лічу, што чалавеку патрэбна быць жыццялюбам, патрэбна верыць у тое, што сёння табе нехай не надта добра, але прыйдзе новы дзень і ён будзе лепшым. Мы ж старой загартоўкі. Як былі маладымі, дык заўсёды казалі: «Жывём мы весела сягоння, а заўтра будзе весялей». І самае галоўнае — ні на кога не мець зла. Чалавекалюбства і незласлівасць, добразычлівасць. Гэта ж добра — вось ужо 87-ы гадочак мне пайшоў!

Ніна Сцяпанаўна Спірыдонава родам з Брэстчыны, інвалід другой групы, ветэран працы — 41 з лішкам гадоў адпрацавала ў школе. Яе сын загінуў. Ён выратаваў двух чалавек на рацэ Кура, калі нечакана адкрылі шлюзы і вада затапіла бераг. А самога знесла хваляй.

— Калі сын загінуў, я смерці хацела, але ягоныя ж дзеткі заставаліся маленькія. Усё так спяшаўся ж

БЕЛАРУСКІ ФЕНОМЕН

Заканадаўча замацаванаму ў краіне двухмоўю пакуль далёка да рэальнага ўвасаблення

Як ні парадаксальна, але ўбачыць і пачуць тытульную мову нацыі сёння цяжкавата. Адзіная беларускамоўная штодзённая грамадска-палітычная рэспубліканская газета пісала нядаўна пра выдатныя пачыны асобных прадпрыемстваў — ужываць у сваёй рабоце беларускую мову. На такіх вось энтузіястах яна, відаць, і трымаецца. А многія бацькі па-ранейшаму аддаюць перавагу рускамоўным класам — навошта дзіцяці рашаць задачкі па хіміі з умовамі па-беларуску, калі потым на ўступным экзамене заданні будуць па-руску? І ў гэтым таксама ёсць рацыя... Мабыць, не так маштабна, як хацелася б, аднак сям-там беларуская мова ўсё ж ужываецца. Гэта і дае ёй жыццё. Ну а жывая мова не можа не развівацца. Вось пра тое, у якім кірунку ідзе гэты працэс, мы і гутарым са спецыялістам — дырэктарам Інстытута мовы і літаратуры імя Янкі Купалы і Якуба Коласа Аляксандрам ЛУКАШАНЦАМ.

— Беларуская мова, як і любая натуральная мова, якая абслугоўвае камунікатыўныя патрэбы пэўнага грамадства, пастаянна змяняецца і развіваецца, — распавядае суразмоўца. — Гэта выклікана тым, што мова — унікальны прадукт чалавечага розуму, які не толькі дазваляе людзям разумець адзін аднаго, але і захоўвае ў сабе папярэдні вопыт носьбітаў мовы. У сувязі з гэтым мова, асабліва яе слоўнікавы склад, вельмі аператыўна рэагуе на тыя змены, якія адбываюцца ў жыцці грамадства. З развіццём навукі, са з'яўленнем новых сфераў дзейнасці, паяўляецца неабходнасць у называнні новых прадметаў і з'яў рэчаіснасці, і адпаведна ў мове паяўляюцца пэўныя сродкі для гэтага.

Асноўнымі спосабамі папаўнення слоўнікавага складу мовы ён назваў словаўтварэнне (утварэнне новых лексічных адзінак на базе ўласнага моўнага матэрыялу) і запазычанне (выкарыстанне лексічных адзінак з іншых моў — як правіла з тых моў, адкуль прыйшлі тыя ці іншыя рэаліі). Беларуская мова «прырастае» таксама і за кошт народных гаворак. «Яна мае народна-гутарковую аснову, таму так лёгка ўспрымае менавіта гэтыя моўныя сродкі», — тлумачыць мовазнаўца.

— Сучасныя тэндэнцыі ў развіцці слоўнікавага складу беларускай мовы — тэндэнцыя да інтэрнацыяналізацыі і да нацыяналізацыі. Першая звязана з інтэнсіўным пранікненнем запазычанняў, перш за ўсё англа-амерыканізмаў. Гэта тэндэнцыя не з'яўляецца спецыфічнай для беларускай мовы, яна закранула большасць еўрапейскіх моў. Апошнім часам пачынаюць гаварыць пра англамоўную інтэрвенцыю, і нават прымаюць меры для змяншэння такога ўплыву. Прыкладаў можна прывесці мноства, аднак найбольш распаўсюджана ўсё тое, што звязана з моўным абслугоўваннем сферы камп'ютарных тэхналогій. Здаецца, не так даўно паявіліся іншамоўныя словы «камп'ютар», «сайт», «файл», «інтэрнэт» і гэтак далей, і ўжо на базе гэтых запазычанняў вельмі інтэнсіўна ўтвараюцца новыя лексічныя адзінкі ў межах самой беларускай мовы і па беларускіх мадэлях. Возьмем адно толькі слова «камп'ютар», а побач ужо цэлае гняздо вытворных слоў, якія з'яўляюцца ўжо ўласнабеларускімі, — «камп'юташчык», «камп'ютарны», «камп'ютарызаваць» і іншыя. Запазычанне — гэта абсалютна натуральны працэс, пытанне хіба што ў колькасці гэтых запазычанняў і мэтазгоднасці іх ужывання. Фактычна гэта праблема культуры мовы, але многія спецыялісты адносна гэтай праблемы схіляюцца да таго, што моўная практыка сама пакажа, што мэтазгодна пакінуць, а што будзе адмецена як лішняе і непатрэбнае.

Выказваючыся пра перспектывы такіх запазычанняў, Аляксандр Лукашанец выказаў упэўненасць, што ў слоўнікавым складзе абавязкова захаваюцца тыя запазычаныя лексічныя адзінкі, якія называюць новыя аб'екты і з'явы рэчаіснасці. А вось лёс тых запазычаных слоў, якія паяўляюцца ў маўленчай практыцы паралельна ўжо існуючым, можа быць зусім іншым. Яны могуць наогул не захавацца ў слоўнікавым складзе мовы, а могуць прывесці да семантычнага размежавання сінанімічных адзінак.

— Слова «імпрэза» (запазычанне з польскай мовы), напрыклад, першапачаткова з'явілася як дублет «мерапрыемству», але ўжо ў сучаснай моўнай практыцы назіраецца семантычнае размежаванне: імпрэза — гэта не проста мерапрыемства, а абавязкова ўрачыстае мерапрыемства. Іншая праблема, што паяўляюцца запазычанні, якія з'яўляюцца лішнімі ў сістэме мовы. Мне такімі ўяўляюцца «кансалцінг» (фактычна гэта «аказанне кансультацыйных паслуг»), «планінг» («планаванне»), «кліенцінг» («работа з кліентамі»). Пытанне ў тым, наколькі мэтазгодна замацоўваць у слоўнікавым складзе такія інавацыі, якія маюць выразнае адценне запазычанасці (гэты англамоўны элемент «інг») і фактычна выступаюць дубле-тамі да вядомых беларускіх намінацый. Тым не менш, запазычанне — гэта натуральны працэс, які заўсёды адбываўся, і ў прынцыпе ён садзейнічае развіццю слоўнікавага складу мовы і таму, каб мова магла выкарыстоўвацца ў найбольш сучасных сферах дзейнасці.

Тэндэнцыя да нацыяналізацыі, наадварот, звязана з актуалізацыяй ва ўжыванні тых моўных сродкаў, якія падкрэсліваюць спецыфіку нацыянальнай мовы. Усё часцей выкарыстоўваюцца ўстарэлыя словы, з'яўляюцца ўласныя наватворы і гэтак далей. Паводле слоў Аляксандра Лукашанца, у апошнія дзесяцігоддзі тэндэнцыя да нацыяналізацыі стала характэрнай не толькі для беларускай мовы, але і для тых славянскіх моў, якія функцыянуюць побач з іншымі, больш моцнымі ў камунікатыўных адносінах мовамі. Напрыклад, яна стала актуальнай для славацкай мовы як тэндэнцыя адштурхоўвання ад чэшскай, для македонскай — як адмежаванне ад балгарскай і гэтак далей.

— У беларускай мове гэта тэндэнцыя праявілася перш за ўсё ў свядомым адштурхоўванні ад рускай мовы, — адзначае навукоўца. — Напрыклад, пашырэнне ўжывання такіх слоў, як «выстава» (замест «выстаўка»), «мытня» (замест «таможня») або выкарыстанне некаторымі носьбітамі слоў «улётка» (замест «лістоўка»), «наступствы» (замест «вынікі»), міліцыянт (замест «міліцыянер»). Пра тое ж сведчыць і вяртанне ва ўжытак слоў, якія былі пашыраны ў 1920-я гады: «адсотак» (замест «працэнт»), «наклад» (замест «тыраж») і іншыя.

У рускай мове ўсё актыўней абмяркоўваецца праблема адпаведнасці моўнай практыкі прынятым нормам. Не выключана, што будзе замацавана ўжыванне назоўніка «кофе» ў ніякім родзе як нарматыўнае, таму што так людзі кажуць. Як ставіцца да гэтага беларускі навукоўца і ці ёсць падобныя выпадкі ў нашай мове?

— Я стаўлюся да гэтага абсалютна спакойна, — запэўнівае Аляксандр Лукашанец. — Сапраўды, унармаванасць — гэта абавязковая прымета літаратурнай мовы, і стабільнасць нормаў забяспечвае функцыянаванне літаратурнай мовы (у тым ліку пісьмовай як разнавіднасці) у розных сферах ужытку. Але разам з тым, паколькі сама мова развіваецца, то адпаведна і норма, наколькі б яна ні была традыцыйнай і ўстойлівай, таксама паступова змяняецца. У рускай маўленчай практыцы сапраўды ёсць тэндэнцыя выкарыстоўваць слова «кофе» ў ніякім родзе. І небеспадстаўна. Большасць «нескланяльных» іншамоўных запазычанняў, якія абазначаюць неадушаўлёныя прадметы, у рускай мове адносяцца да слоў ніякага роду. І ў гэтым сэнсе выкарыстанне слова «кофе» ў ніякім родзе ў цэлым адпавядае асноўнай норме рускай мовы, паводле якой нескланяльныя іншамоўныя назоўнікі на -е (напрыклад, «кашне») традыцыйна адносяцца да ніякага роду. А замацаванне ў якасці нарматыўнага ўжывання гэтага слова ў мужчынскім родзе звязана з тым, што першапачаткова выкарыстоўвалася форма «кофий», якая склонялася і цалкам адпавядала прынцыпу, што словы іншамоўнага паходжання на -ий, -ый адносяцца да мужчынскага роду (напрыклад, «санаторий», «мараторий»). Таму абсалютна натуральна будзе адносіць слова «кофе» да ніякага роду. Важна, каб такія змены не былі стыхійнымі, масавымі, каб не парушылася стабільнасць і нарматыўнасць мовы. Тое ж самае можна сказаць пра акцэнталагічныя нормы: у рускай мове цяпер можна гаварыць «твОрог» і «творОг», «кулинАрия» і «кулинарИя». У беларускай маўленчай практыцы зараз назіраецца тэндэнцыя да пашырэння выкарыстання канчаткаў -аў, -яў у назоўніках жаночага роду ў родным склоне множнага ліку замест нарматыўных —эй,-ей. Напрыклад: *уласцівасцяў*, *асаблівасцяў*. Вядома ж, гэтыя змены не вельмі пажаданыя. Аднак у рэшце рэшт моўная практыка дыктуе норму. І калі такія канчаткі стануць агульнаўжывальнымі, не выключана, што яны атрымаюць і нарматыўнае замацаванне.

Навукоўца падкрэсліў таксама, што слоўнікі павінны рэгулярна абнаўляцца, каб у іх склад уключалася актуальная лексіка.

— Размова можа ісці не толькі пра такія фундаментальныя слоўнікі, падрыхтоўка і выданне якіх патрабуе шмат часу, але і пра слоўнікі новых слоў, у тым ліку і іншамоўных запазычанняў, якія б і тлумачылі іх значэнне, і рэгламентавалі ўніфікаванае напісанне. Гэта вельмі актуальная праблема, асабліва для беларускай мовы. Бо яе правапіс у значнай ступені грунтуецца на фанетычным прынцыпе, які не заўсёды можна паслядоўна прымяніць для слоў іншамоўнага паходжання. Мяркую, што ў хуткім часе паявіцца такі слоўнік новых актуальных іншамоўных слоў. А пакуль яго няма, я парэкамендаваў бы ўсім прытрымлівацца ў сваёй моўнай практыцы, нават пры выкарыстанні найноўшых запазычанняў, тых агульных прынцыпаў, якія замацаваныя ў дзеючых правілах беларускай арфаграфіі. Тады праблем будзе значна менш.

Пагутарылі мы і пра перспектывы развіцця беларускай мовы:

— Беларускай мове трэба пазбавіцца ад комплексу адштурхоўвання ад той жа рускай мовы, — выказаў меркаванне навукоўца. — Калі гэта самастойная нацыянальная мова, то і самой сістэме мовы, і яе носьбітам павінна быць усё роўна, наколькі яна блізкая да суседніх рускай і польскай моў. Тады праблемы літаратурнай нормы і слоўнікавага складу сучаснай беларускай мовы будуць стаяць не так востра.

Ён таксама адзначыў відавочную праблему абмежаванасці ўжывання беларускай мовы:

— Сёння ў нашай краіне дзве мовы маюць аднолькавы заканадаўчы статус. Аднак пры гэтым яны маюць неаднолькавае пашырэнне ў грамадстве. Беларуская мова, з'яўляючыся тытульнай мовай нацыі, зараз дастаткова абмежавана выкарыстоўваецца ў многіх сферах, якія ў прыватнасці і фарміруюць прэстыж мовы. Таму вельмі актуальнай на сёння з'яўляецца выпрацоўка дзяржаўнай праграмы канкрэтных мераў, якія павінны забяспечыць рэальнае двухмоўе, як гэта і прадугледжана ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым і самім грамадзянам, носьбітам мовы, трэба ведаць свае правы і навучыцца іх адстойваць. Таму што ў прынцыпе дзяржаўнае двухмоўе пры яго дэмакратычным разуменні азначае, што кожны грамадзянін краіны мае права карыстацца любой дзяржаўнай мовай. З другога боку, дзяржава павінна забяспечыць кожнаму грамадзяніну такую магчымасць. А гэта азначае, што кожны дзяржаўны служачы як прадстаўнік менавіта дзяржавы павінен рэальна валодаць дзвюма мовамі. Толькі тады можна будзе забяспечыць канстытуцыйна гарантаванае грамадзянам права свабодна карыстацца любой дзяржаўнай мовай.

Ала МАЧАЛАВА.

Наш культурны асяродак
ЖЫВАНДОЛЯ
Выпуск № 19 (41)
18 кастрычніка 2008 г.
3 ЗВЯЗДА

Тэлесеткі

У НОВЫМ СЕЗОНЕ «ЛАД» ПАКАЖА ПРАГРАМЫ ДЛЯ ДУШЫ, ДЛЯ ЦЕЛА І ДЛЯ БАГАТАЙ ФАНТАЗІІ

(Заканчэнне. Пачатак у папярэднім нумары.)

...МУЗЫКАЙ

Юбілейным датам, як правіла, спадарожнічаюць вялікія канцэрты. «ЛАД» ад гэтай традыцыі не адмаўляўся — проста не атрымалася трапіць на тэрмін 17—18 кастрычніка. Але напрыканцы месяца нам абяцаны вялікі канцэрт з удзелам «вядомай еўрапейскай зоркі», імя якой, зрэшты, пакуль што не называецца.

У звычайным, несвяточным эфіры таксама знойдзецца месца музычным праграмам: ужо знаёмы праект «Прасоўванне +» працягне здымаць беларускім артыстам малабюджэтныя, але часта даволі цікавыя па сюжэце і рэалізацыі кліпы, а праграма «Жывая музыка» запросіць да мікрафона ўсіх, хто ўмее і не баіцца спяваць жыўцом (нарэшце будзе добрая нагода даведацца, хто ўсе гэтыя людзі).

...ФАНТАСТЫКАЙ

З праграм, якія паспяхова прайшлі ўжо на расійскіх каналах, у новым сезоне беларусы ўбачаць ажно тры «надзвычайныя». У забаўляльным шоу «Гіпноз» добраахвотнікі з залы, пагадзіўшыся выпрабаваць гіпноз на сабе, здзяйсняюць незвычайныя ўчынкі або раскрываюць у сабе таленты, пра якія раней нават не здагадваліся — танцуюць балет, ходзяць па шкле, размаўляюць з іншапланецянамі і г.д. Назва праграмы «Невытлумачальна, але факт» гаворыць сама за сябе — калі нейкую з'яву немагчыма растлумачыць з пункту гледжання логікі, застаецца проста прыняць яе і паверыць, што бывае нават тое, чаго, здаецца, быць не можа... А чарговы сезон «Бітвы экстрасэнсаў» набыты па шматлікіх просьбах беларускіх гледачоў — больш за тое, чацвёрты сезон праграмы неўзабаве будзе здымацца менавіта ў Беларусі, і айчынным майстрам звышнатуральных сілаў выпадае шанц пацвердзіць, што яны сапраўды — майстры, а не шарлатаны.

Акрамя таго, нейкі фантастычны сюрпрыз — у сэнсе тэхнічнага ўвасаблення — рыхтуе канал да Новага года. Ужо вядома, што дакладна не будзе ніякіх шоу, канцэртаў і мюзіклаў, бо «ўбухаць усе грошы ў адну песню і потым чуць яе на пяці каналах — гэта эканамічна немэтазгодна», лічыць Сяргей Кухто. Што ж тады будзе — невядома, але для гэтага «чагосьці» закупаецца цяпер вялікае мноства складаных тэхнікі.

...І НАВАТ ЭРОТЫКАЙ!

Праўда, будзе яна лёгкай, сцвярджаюць на «ЛАДзе». А доза — зусім невялікай, у межах рубрыкі для дарослых «Казкі на ноч» у праграме «Казанова». Гэты праект кіраўніцтва ўжо вырашыла было зняць з эфіру, але здымачная група прад'явіла зусім новы, іранічны і лёгкі для ўспрымання, фармат, таму праект пакінулі ў сетцы вяшчання. Весці яго цяпер будзе гэткі немалады, але ўсё ж мача — вядомы гомельскі акцёр Сяргей Чугай.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Свету ёсць чаму павучыцца ў Беларусі

Да такога выніку прыйшлі ўдзельнікі міжнароднага «круглага стала» «Устойлівы этнаканфесійны мір — адзін з важнейшых фактараў сацыяльна-палітычнай стабільнасці ў грамадстве», пасяджэнне якога адбылося 13—14 кастрычніка ў Мінску.

Гэта не першая сумесная работа прадстаўнікоў розных рэлігій у нашай краіне. Аднак гэта першы форум, які паставіў задачу ўключыць у супрацоўніцтва не толькі хрысціян і мусульман, але і іншыя рэлігійныя, а таксама нацыянальныя аб'яднанні Беларусі, дзяржаўныя інстытуты і сродкі масавай інфармацыі. Арганізатары форуму — Мусульманскае рэлігійнае аб'яднанне ў Рэспубліцы Беларусь, Савет муфціяў Расіі, Ісламскі культурны цэнтр Расіі, Беларускае грамадскае аб'яднанне татар «Зік уль-Кітаб», Міжнародны фонд развіцця татара-башкірскай духоўнай спадчыны «Чышма».

— Аналітыкі прыходзяць да выніку, што Еўропа хутка будзе іншай: інтэграцыйныя працэсы сучаснасці падводзяць да новай ацэнкі якасці супольнага чалавечага жыцця, — заўважыў у сваім выступленні старшыня «круглага стала» **муфцій Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Рэспубліцы Беларусь Абу-Бекір ШАБАНОВІЧ**. — І гэта ацэнка немагчыма без уліку ісламскага фактара. Пра гэта кажа ўжо той факт, што прыкладна кожны пяты чалавек у свеце спавядае сёння іслам. Ісламскія закліканы забяспечыць стабільнасць грамадства ў садружнасці з іншымі рэлігіямі.

Сённяшні свет перажывае цяжкі крызіс, нагадаў старшыня пасяджэння, войны і зоны канфрантацыі набліжаюцца да межаў Беларусі, таму ўзнікае неабходнасць сабрацца разам і вырашыць: якія павінны быць сумесныя дзеянні нацыянальных і рэлігійных аб'яднанняў, што трэба рабіць, каб збераглі мір і спакой у краіне, падаць прыклад сусветнаму супольніцтву. Год таму на Міжнароднай канферэнцыі «Дыялог хрысціянства і ісламу», якую праводзіла Беларуская Праваслаўная Царква, быў зададзены тон, выведзена культура агульнай размовы. Міжнародны «круглы стол» «Устойлівы этнаканфесійны мір» з'яўляецца працягам і пашырэннем падобнага супрацоўніцтва.

— Мы ведаем цану міру, — падкрэсліў **намеснік Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Уладзімір ЛАМЕКА**. — Сучасная беларуская дзяржава працягвае лепшыя традыцыі нашых продкаў, ствараючы неабходныя ўмовы для дзейнасці рэлігійных арганізацый у краіне. Беларусь знаходзілася на перакрыжаванні заходняй і ўсходняй культур, на якой здаўна прысутнічала хрысціянства, а пазней мусульманства і іудаізм. Лепшыя традыцыі талерантнасці, добрасуседства дапамагалі нашым людзям у канструктыўным узаемадзеянні ствараць унікальную культурна-гістарычную сітуацыю, супольнасць, у якой добразычлівасць і міралюбнасць былі асноўнымі складнікамі нашага жыцця.

Ён заўважыў таксама, што ў Беларусі няма падзелу паміж прадстаўнікамі розных нацый і рэлігій па даўнасці пражывання. Усе маюць роўныя правы. У дзяржавы склаліся канструктыўныя адносіны з рэлігійнымі і нацыянальнымі арганізацыямі, яна асэнсоўвае іх вялікі патэнцыял.

Мітрапаліт Мінска-Магілёўскай архіепархіі Рымска-каталіцкай царквы ў Рэспубліцы Беларусь Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ выступіў з дакладам «СМІ ў рэлігійнай і нацыянальнай сферах: арбітр, правакатар ці міратворац?»

— Пры розных адзнаках ступені ўплыву сродкаў масавай інфармацыі на свядомасць социыуму цяжка адмаўляць той факт, што ў сучасным свеце яны з'яўляюцца найбольш уплывовым фактарам, які фарміруе грамадскую свядомасць. Гэта датычыцца таксама і пытанняў адносінаў паміж людзьмі розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў, — адзначыў Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

«Бэтмэн» вяртаецца з дзяцінства

Яго завуць Патап. Прынамсі, у спектаклі тэатральнага праекта «АРТ — ПРО», прэм'ера якога адбылася на сцэне сталічнага Палаца прафсаюзаў. Камедыю двух дзяцей і трагедыю дарослых паставіў Алег Коц паводле твораў польскіх аўтараў Кшыштафа Бізэ і Міхала Вальчака.

Дзеянне спектакля «Я, яна і Бэтмэн» адбываецца ў маленькім дворыку, дзе гуляюць дзеці. А хлопчык Патап гуляе ў супергероя. Але ў свеце Патапа Бэтмэн — хутчэй, антыгерой... Але гульні дзяцей ідуць паралельна з гульнямі дарослых, якія больш жорсткія. І тая барацьба паміж дабром і злом, якая ў дзяцей выглядае камічна, у дарослым свеце ператвараецца ў трагедыю...

Ларыса ЦІМОШЫК.

ДЗЕНЬ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ Ў КАТАВІЦАХ

Ён быў арганізаваны Шлёнскім ваяводскім аддзелам Аб'яднання супрацоўніцтва «Польшча-Усход» з удзелам пасольства і Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы.

У Палацы моладзі горада Катавіцы выступіў ансамбль акардэаністаў «Туці» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, адкрыліся выставы сучаснага беларускага жывапісу і мастацкай фатаграфіі, быў прадэманстраваны тэлевізійны фільм вытворчасці Белтэлерадыёкампаніі «Адам Міцкевіч».

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Васіль Ткачоў

ПРАЦЭНТ

Апавяданне

Ужо вечар Ягор доўга не мог заснуць, варочаўся-круціўся ў ложку, мумкаў нешта сабе пад нос... Хаця чаму — нешта? Сам сабе ён даводзіў адно і тое ж — пра працэнт.

— Маруся, чуй-ка... Адкуль яны ўзялі яго, той працэнт? Як вывелі? Адкуль выкалупалі? Ты вось мне скажы, у школу ж хадзіла: адкуль яны, разумнікі, ведаюць, колькі людзей «супраць» будаўніцтва хімзавода, колькі — «за»? І ў такім, значыць, парадку далей... І ў каго яны ўвесь час пытаюць? Хто тыя людзі? А хто ж тады я? Ты слухаеш мяне, баба?

— Спі ўжо, грамацей!

Ягор не супакойваўся. Як можна спаць, калі працэнт той, сёння падслуханы ў эфіры, не дае, вярэдзіць душу, вывярочвае яе навыварат? Раней жыў жа неяк стары, прапускаў міма вушэй пра той ці іншы працэнт, што называюць па радыё альбо тэлевізары, а сёння вазьмі ды і зачалі, халера, ён яго, як ўсё роўна жывы жывога. Быццам ішоў стары спакойна сабе па вясковай вуліцы, а працэнт той і з'явіўся нечакана, нібы з зямлі вытыркнуўся, прама перад ім — лоб у лоб.

— Ніхто апошнім часам да нас у вёску не прыязджаў, акрамя сваіх, — не мог уняцца Ягор. — Хітрая справа, аднак... Ці я, можа, ужо і не ў залік. Можа, мяне, як старую запчастку на мехдвары, адкінулі ўбок? Ці чуш ты, маладзіца?

Жонка заварушылася ў ложку, пагрозліва заявіла Ягору:

— Ты дасі мне спаць ці не?! Позна ж ужо!..

Ягор хехекнуў, кашлянуў, павярнуўся тварам да сцяны, сказаў ні тое сабе, ні тое жонцы:

— Хаця на выбары галасаваць іду. Чыслюся, значыць, яшчэ ў спісах, ёсць на ўліку. Можа, і засну... Калі ж не спіцца... Хоць і пасцель не мулкая быццам... А ўсё ж, адкуль яны выцарапалі той працэнт, мне цікава?..

Гэта былі апошнія словы, якія пачула ў той позні вечар Маруся ад свайго Ягора. Ён нарэшце зусім сцішыўся: заснуў.

Раніцай, ледзь прадраўшы вочы, стары, ні слова не сказаўшы жонцы, патупаў на падворак. Пачуўшы яго крокі, у хлеўчуку зарохкаў парсючок, мыкнула карова, а куры, як толькі Ягор паказаўся перад імі, разляцеліся ў розныя бакі — былі і няма: учора стары якраз скруціў адной галаву, бо Марусі дужа булёну захацелася, то цяпер, злапамяты, будуць доўга яго шарахацца, на крок не падпусцяць.

Ягор сеў на лаву пад акном, закурыў. І зноў — вось даўся ён яму!? успомніў пра той працэнт.

— Ступай снедаць! — паклікала жонка.

Ёй, бачце вы, снеданне тое на ўме, калі тут вырашаюцца, можна сказаць, глабальныя праблемы. Як? Адкуль? — вось што хвалюе Ягора, а не курыная лытка. Працэнт хвалюе. Вырашыў падзяліцца сітуацыяй з суседам Пятром, той якраз пачаў зграбаць лісце ў садзе — праз дзіркі ў паркане яго было добра відаць. Падышоў. Павіталіся.

— Грабеш? — у працяг размовы папытаў Ягор.

— Як бачыш, — спакойна адказаў сусед.

— Ну, ну... А ты вось скажы мне: ты за хімзавод ці не?

— Хай будзе... Пятро перастаў грэбці лісце, зняў з лысай галавы картуз. — Сухое лісце, згарыць хутка. Ты ўжо даруй, сусед, калі трохі цябе дымком абдасць — вецер акурат у твой бок.

Ягор махнуў рукой:

— Сёння ты мяне абкурыш, заўтра я цябе. Бяды тае. Ты вось скажы мне, адкуль там, у цэнтры, ведаюць, хто з нас, з народу, «супраць», хто «за», а хто, значыць, «устрымаўся»? Я гэта наконт завода...

Пятро зноў насунуў на галаву картуз, пачаў зграбаць пад ігрушай і сапраўды сухое — ажно пакурчылася — лісце, а сам думаў, як адказаць Ягору на ягонае пытанне. І само неяк у яго так атрымалася, што ён узяў ды і схлусіў — ну, пажартаваў, так дакладней будзе сказаць:

— Як адкуль? Мне, напрыклад, дзён колькі таму з Мінску пазванілі. Не ведаю, як каго, а мяне патурбавалі. Хіба я табе не хваліўся?

— Не...

— Было. Ага. Сам прафесар... З акадэміі навук, відаць. Калі не вышэйшы чын. Голас такі ветлівы, памяркоўны... Так і так, пытае, як вы адносіцеся?.. Я кажу: нармальна, будуйце. А ён мне: дзякуй, так і запішам. Ваша думка будзе ўлічана.

— Хлусіш? — не паверыў, вядома ж, Ягор, і злосна плюнуў. — Хлусіш! Адкуль яны ведаюць пра цябе? Адкуль, ты вось скажы мне? Ты хто такі?! Хто?!..

— Ведаюць жа неяк.

— А чаму тады мяне не патурбавалі? Я што, у турме сядзеў ці, можа, шкодзіў дзе ў іншым месцы? Адкажы!

— Вось гэтага, братка, я не ведаю, — адбіваўся Пятро і потайкам усміхаўся. — Чаму ты выйшаў там, у горадзе, з даверу, — сказаць не магу. У кніжцы ж і твой тэлефон маецца. А не пазванілі. Значыць, не заслужыў.

Ягор, нічога не сказаўшы больш суседу, раптам павярнуўся і рашуча патупаў у хату — снедаць. На стале стаяла ўжо пэўны час тэпельня з падсмажанай апетытнай курацінкай, таму Маруся прыкрыла яе вечкам, каб яна зусім не астыла, а бульбу падала да стала адразу, як толькі паказаўся на парозе стары.

— Што там Пятро робіць? — пацікавілася, бы між іншым, жонка.

— Брэша! — Ягор падсеў да стала, узяў лыжку, патрымаў яе ў руцэ, а потым зноў паклаў на ранейшае месца. — «Не заслужыў». Вы чулі такое, людзі? Гэта я не заслужыў? Я? — крыху супакоіўшыся, папытаў: — Ты, гэта, старая, апошнім часам ніякіх званкоў не прымала?

Маруся не зразумела старога, падняла на яго вочы:

— Не, ніхто не званіў. А чаму гэта ты пытаеш? А? Нават мне цікава стала.

— Адстань хоць ты!.. А яму, бачце вы, патарабанілі з самога Мінска! — не мог супакоіцца Ягор. — Брэша? Ці як ты думаеш, маладзіца?

Жонка паціснула плячыма:

— Чаму ж і не могуць? Там у яго сын і дачка. Тарабаняць часта. Еш давай, не сядзі! Ці цябе карміць трэба, як малога дзіцёнка?

Ежа не лезла ў рот старому. Ён піхаў яе і так і гэтак, давіўся, але, здавалася, і сам не заўважаў гэтага, галава была забіта іншым. Стары пачынаў верыць Пятру, патрохі змірыўся з тым, нібыта яго насамрэч абмінулі і згадваў сваё жыццё: дзе б ён і сапраўды мог так набедакурыць, што нават і цяпер, у адказны час, калі вырашаецца пытанне з заводам, на яго махнулі рукой: сядзі і не высоўвайся, ты не заслужыў. Лаяўся са старшынёй калгаса? Было. За праўду біўся. Ну, вырваўся мацюк, дык рот жа не зашыеш. А больш?.. Дык больш і няма пагрэшнасцяў. Адны плюсы: прымаў, удзельнічаў, ствараў...

Паснедаўшы, Ягор вырашыў схадзіць да вясковага прымака Цуцыка, той нядаўна вярнуўся з зоны: калі ўжо і ў яго цікавіліся, а ў мяне не, разважаў стары, то трэба прымаць меры. Неадкладна. Сёння пра завод не пацікавіліся, заўтра на выбары не запросяць... Зусім сядуць на галаву. Заключыць.

— Куды гэта ты? — стрэлася старому на дварэ Маруся з бярэмем дроў.

— Табе ўсё знаць трэба, — надзьмуўся Ягор. — Народны кантроль. Што, і выйсці нельга? А тут, дома, ты, гляджу, мяне заціскаеш? З усіх бакоў агрэсія. Прапусці, не стой папярок!..

Ягор знік за веснічкамі, пачыкільгаў на дарогу, а старая ўсё яшчэ чула яго хрыплаваты голас:

— Вазьміце мой працэнт. Наце. Трымайце. Я хіба супраць? Толькі спярша папытаць трэба... У такіх, як я, людзей... А то вы, гарадскія, там напрацэнціце... Не пашкадую... Аддам. Зразумела, у Петрака сын у горадзе, дачка... Вядома ж... Я разбяруся... Але ж і я ведаю, куды свой працэнт прыткнуць. З якога боку... Хто-хто, а за Ягорам не стане... Так што майце на ўвазе, мае дарагія!..

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

21 ноября 2008 г. проводит открытый аукцион с условиями № 1-У-08 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

Вид аукциона: открытый (на повышение цены продажи).
Предмет аукциона: право проектирования и строительства капитального строения (здания и сооружения) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты недвижимости, подлежащие сносу.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Минске на 6 земельных участках, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

Лот №	Место расположения земельного участка	Площадь земельного участка, га	Функциональное назначение земельного участка	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб.	Наличие обременений	Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости
1	ул. Козлова – ул. Смолячкова – ул. Краснозвездной – ул. Михайлова	0,3	Жилой дом повышенной комфортности с объектами общественного назначения	351 726 120	17 586 310	4 229 927	снос 2-этажных жилых домов	905 016 506
2	4-ый пер. Кольцова	1,7124	Многофункциональный объект общественного назначения	2 032 937 991	101 646 900	5 581 133	снос открытых стоянок автотранспорта	1 207 473 656
3	пер. 2-й Радиаторный, 37	0,1278	1-2-х квартирный малоэтажный жилой дом повышенной комфортности с приквартирным участком	130 586 960	6 529 348	3 681 561	снос ветхого нежилого строения	138 360 816
4	ул. Мирошниченко	0,5338	Многоуровневая автостоянка с сопутствующим сервисом и помещениями торгового и общественного назначения	591 686 614	29 584 330	4 770 959	снос существующей плоскостной автостоянки № 31 УП «Гаражи, автостоянки и парковки»	131 445 459
5	парк имени Челюскинцев	0,2818	развлекательный центр	327 891 433	16 394 570	2 637 726	снос административного здания открытого амфитеатра	132 578 600
6	парк имени Челюскинцев	0,0723	павильон игровых автоматов	91 385 002	4 569 250	2 746 652	снос ветхих сооружений	42 349 280

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится 21 ноября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток в размере 5 % от начальной цены заявленного лота (лота с наибольшей стоимостью – в случае участия в торгах по нескольким лотам), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома;

представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, победивший в торгах, либо которому земельный участок предоставляется по начальной цене в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь, обязан произвести оплату организатору аукциона за его организацию и проведение в размере 4 % от начальной цены предмета торгов и 5 % от суммы превышения цены продажи соответствующего лота над его начальной ценой.

дополнительно представляется:

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Пр

САПРАЎДНЫМ ПРАФЕСІЯНАЛАМ ЛЮБАЯ ПРАЦА ПАД СІЛУ

Сваё 70-годдзе камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Віцебскаблдарбуд» сустракае на ўздыме і ўпэўнена крочыць у заўтрашні дзень

А пошлюм часам у айчыннай эканоміцы адбываюцца відавочныя змены да лепшага. Пазітыўную дынаміку прызнаюць шэраг экспертаў. Беларусі ў поўнай меры ўдалося не толькі захаваць свой магутны вытворчы патэнцыял, але і нарасціць яго, стварыць перадумовы для перспектыўнага, дынамічнага сацыяльна-эканамічнага развіцця ўсяго народнагаспадарчага комплексу. Вытворчая база аператыўна абнаўлялася і абнаўляецца ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі. Найноўшыя тэхналогіі сталі даступнымі беларускім прадпрыемствам. Інтэнсіўнае мадэрнізацыя — характэрная рыса дня сённяшняга.

Устаданні ў тэхнічнае і тэхналагічнае пераўзбраенне можна без перабольшання назваць сапраўднымі інвестыцыямі ў будучыню. Дзякуючы актыўнаму сацыяльна-эканамічнаму развіццю ў дастатковай колькасці з'явіліся сродкі мясцовых дарог усяго паўночнага рэгіёна. Як у іх гэта атрымліваецца, мы і вырашылі пераканацца, што называецца, на ўласныя вочы. Кіраўнік Віцебскага абласнога дарожнага аддзела быў прызначаны Павел Мікфодьевіч Рашчэнка. Напэта, у сакавіку 1939-га, былі створаны дарожна-эксплуатацыйныя ўчасткі на дарогах абласнога значэння і зацверджаны парадак перадачы ДЭУ-105, ДЭУ-106, ДЭУ-107, ДЭУ-108, ДЭУ-109 і ДЭУ-110. Пазней пачалі працаваць ДЭУ-131 і ДЭУ-132. Вельмі важная таксама рыса ў гісторыі развіцця галіны на Віцебшчыне — мэнавіта ў напрамках 1950-х гадоў стваралася перадумовы для актывізацыі дарожна-будаўнічага комплексу адначаснага ключавых рэгіёнаў нашай дзяржавы.

У самым пачатку

Нездарма ў адным песенным шлягеры гады пасляваеннай адбудовы ў народзе назвалі сярэдзінай залатога часу. Гэта сапраўды багацце якое асобнага чалавека, так і працоўнага калектыву. Такім чынам фарміруюцца традыцыі, камандны дух, стваральнае гісторыя. У выпадку з «Віцебскаблдарбудам», на наш погляд, шлях развіцця аказаўся вельмі адметным, таму адным падзеямі і прафесійнымі здзяйсненнямі. Узгадаць падчас святкавання юбілею сваіх сяброў і калег — значыць ўшанаваць усіх, хто ў мая 1938 года (таксама сімвалічная дата, хіба не так) Савет Народных Камісараў БССР, выконваючы пастанову ўсесаюзнага СНК № 526 ад 22 красавіка таго ж года «Аб ажыўленні дарожнай гаспадаркі» прыняў пастанову № 1180 «Аб утварэнні Галоўнага дарожнага ўпраўлення пры СНК БССР і дарожных аддзелаў пры абласных выканаўчых камітэтах».

У адпаведнасці з зацвярджаным дакументам Ушэсдар НКУС БССР выдзеліў патрэбную колькасць інжынерна-тэхнічных работнікаў. Гэтыя спецыялісты былі неабходныя для таго, каб наяўныя чынам укамплектаваць штаты Галоўнага дарожнага ўпраўлення пры Савеце Народных Камісараў БССР і спецыялізаваных дарожных аддзелаў пры абласных выканаўчых камітэтах. Ставілася задача ў сціслыя тэрміны завяршыць перадачу і прыём усіх лімітаў па капітальўкладаннях і бюджэтным асігнаванні бягучага года, матэрыяльна-тэхнічных фондаў па перадаваемых дарогах у аддзелаў-нікаў са спісам дарожных станцый і атрадаў, які быў зацверджаны СНК ССР. Гэта была сапраўдная кропка адліку развіцця дарожнай галіны на Віцебшчыне. Пачалася вялікая работа, вядомая ў цягам чвэрці стагоддзя як «Віцебскаблдарбуд».

Штат Віцебскага дарожнага аддзела быў зацверджаны 4 верасня 1938 года асобнай пастановай СНК БССР № 1917. У адпаведнасці з гэтым дакументам у штатны расклад падпарадкаваных былі ўваходзіць 16 чалавек. Паводле інфармацыі, якая захавалася ў архівах, на 1 кастрычніка 1938 года ў аддзеле працаваліа 13 чалавек. У той час дарожны аддзел падпарадкоўваўся Віцебскаму абласному Савету дэпутатаў і ўваходзіў у склад Галоўнага дарожнага ўпраўлення пры СНК БССР. Першым дырэктарам Віцебскага абласнога дарожнага аддзела быў прызначаны Павел Мікфодьевіч Рашчэнка. Напэта, у сакавіку 1939-га, былі створаны дарожна-эксплуатацыйныя ўчасткі на дарогах абласнога значэння і зацвярджаны парадак перадачы ДЭУ-105, ДЭУ-106, ДЭУ-107, ДЭУ-108, ДЭУ-109 і ДЭУ-110. Пазней пачалі працаваць ДЭУ-131 і ДЭУ-132. Вельмі важная таксама рыса ў гісторыі развіцця галіны на Віцебшчыне — мэнавіта ў напрамках 1950-х гадоў стваралася перадумовы для актывізацыі дарожна-будаўнічага комплексу адначаг з ключавых рэгіёнаў нашай дзяржавы.

Дарога праз гады

Яшчэ адзін з гістарычных момантаў — 10 красавіка 1959 года прынятый Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР «Аб удзеле калгасаў, саўгасаў, прамысловых, транспартных, будаўнічых і іншых прадпрыемстваў і гаспадарскіх арганізацый у будаўніцтве і рамонце мясцовых аўтамабільных дарог». Як бачна ўжо з назвы дакумента, з тагo часу насельніцтва вызвалялася ад абавязкаў па будаўніцтве і рамонце дарожнай сеткі. Змянялася сістэма — з гэтага часу аднаведныя заданні атрымлівалі арганізацыі і прадпрыемствы розных галін народнай гаспадаркі (у тым ліку і аграпрамысловага комплексу). У адпаведнасці з Указам ВС БССР суб'ектам гаспадаранння даводзіліся канкрэтныя аб'ёмы дарожных работ. Гэтыя заданні ўключаліся ў гадавыя вытворча-фінансавыя планы.

Структура кіравання будаўніцтвам і эксплуатацыяй аўтамабільных дарог была сфарміравана ў 1965 годзе. У той час былі створаны яшчэ 13 дарожна-эксплуатацыйных участкаў, праектна-каштарысное бюро. А пасля — дырэкцыя будаўнічых дарог і ўпраўленне вытворча-тэхнічнай камплектацыі. Такая сістэма арганізацыі на справе даказала свако эфектыўнасць. Адзін з цікавых здымкаў, які захаваўся ў фотаархіве прадпрыемства, адлюстроўвае пікнік-рэпартаж — Віцебскаму абласному вытворчаму ўпраўленню будаўнічага і эксплуатацыі аўтамабільных дарог як пераможцу ва ўсесаюзным сацыялістычным спаборніцтве за выкананне плана сацыяльна-эканамічнага развіцця за 1982 год уручаецца пераходны Чырвоны сцяг.

У пачатку 1989 года ў аднаведнасці з сумесный пастановай выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета народных дэпутатаў і калегіі Міністэрства будаўніцтва і эксплуатацыі аўтамабільных дарог было створана праектна-рамонтна-будаўнічае аб'яднанне па праектаванні, будаўніцтве, рамонце і ўтрыманні мясцовых аўтамабільных дарог пры аблвыканкаме («Віцебскаблдарбуд»). Арганізацыю стварылі на базе вытворчага ўпраўлення будаўнічага аддзела, такога ж, як і ўсе астатнія. Такое парэформаванне ў чарговы раз падкрэсліла тую ролю, якую адыгрываюць дарогі ў агульным сацыяльна-эканамічным развіцці. Калі банкаўскую галіну называюць сэрцам эканомікі, то дарожную можна лічыць крывяноснай сістэмай. Такое параўнанне, напэўна, надта больш поўна адлюстроўвае ее месца сярод нацыянальных прыярытэтаў.

Многія з тых, хто наведвае Беларусь, адзначаюць добры стан не толькі буйных дарог, але і сеткі мясцовых «стрыт». Самі былі таму сведкамі — калі расійскія журналісты трапілі ў самую што ні на ёсць бераларускую глыбінку, то былі пад вялікім уражаннем ад таго, якія там дарогі. Госці чакалі ўсё страшэ нешта напаўразбурнае, а бачылі цывілізаванныя прасторныя шляхі. Нездарма ж дарожнікі Віцебшчыны ўдзел ва ўвасабленні грунтоўнай дзяржаўнай Праграмы развіцця і адраджэння вёскі. Пляшэнне сэрвісу — гэта ў тым ліку і стан мясцовых дарог, мастоў. Дарожнікі падтрымліваюць іхную сетку ў належным стане. Вопыту і майстэрства ім не займаць.

У поўнай меры такое сцвярджэнне можна адпесці і да работнікаў Галоўнага дарожнага будаўніцтва Віцебскаблдарбуд», якое адзначае 70-годдзе ад дня ўтварэння. Слаўны юбілей прадпрыемства сустракае ў добрай форме: вялікі калектыў сапраўдных прафесіяналаў забяспечвае належны стан сеткі мясцовых дарог усяго паўночнага рэгіёна. Як у іх гэта атрымліваецца, мы і вырашылі пераканацца, што называецца, на ўласныя вочы. Кіраўнік Віцебскага абласнога дарожнага аддзела быў прызначаны Павел Мікфодьевіч Рашчэнка. Напэта, у сакавіку 1939-га, былі створаны дарожна-эксплуатацыйныя ўчасткі на дарогах абласнога значэння і зацвярджаны парадак перадачы ДЭУ-105, ДЭУ-106, ДЭУ-107, ДЭУ-108, ДЭУ-109 і ДЭУ-110. Пазней пачалі працаваць ДЭУ-131 і ДЭУ-132. Вельмі важная таксама рыса ў гісторыі развіцця галіны на Віцебшчыне — мэнавіта ў напрамках 1950-х гадоў стваралася перадумовы для актывізацыі дарожна-будаўнічага комплексу адначаг з ключавых рэгіёнаў нашай дзяржавы.

Новая дарога з'явіцца ў віцебскім мікрараёне Поўдзень-7. Тут фотаздымкі ўбачылі дарожнага майстра ДРБУ-110 Георгія ШЭМЧУКА і аўтаграйдарыста Аляксандра БУЛЬНІЮ.

Будаўніцтва моста каля вёскі Смальяны Аршанскага раёна — адзін з самых адказных аб'ектаў. Хутка і якасна працуюць тут дарожнікі, сярод якіх экскаватарчык Сяргей МІЛЫЙ, майстар Сяргей ГАРДАШ, рабочы Аляксандр ГАРБЁНАК.

Генеральны дырэктар КУП «Віцебскаблдарбуд» Валерый ЛАППО: «Дарожная галіна знаходзіцца на перадавым краі не толькі эканомікі, але і сацыяльнай палітыкі. Стан дарог — адзін з важнейшых дзяржаўных прыярытэтаў. Да гэтага неабходна ставіцца з усёй адказнасцю і сур'ёзнасцю. І будзьце ўпэўненыя — дарожнікі не падвядуць».

Жыхары аграгарадка Стасева маюць усе падставы дзякаваць дарожнікам Лёзненскага ДРБУ-107, якія занятыя добраўпарадкаваннем дарог у названым населеным пункце. Гэтыя фотаздымкі знаёмяць з пейзажам новай вёскі і тымі, хто працуе тут. На здымку злева направа: Сяргей ВАРАНУХА, Барыс МАЧАЛА, Мікалай ПЕТУХОЎ, Васіль ПАЗІКАЎ, Валерый ЗАХАРАЎ, Аляксей ЛІСОЎСКІ.

Трэцяя частка экватара

Маштабы работ, што праводзяцца на цяперашнім этапе, яскрава адлюстроўваюць адпаведныя лічбы. Мяркуйце самі: на пачатак гэтага года сеткі мясцовых аўтамабільных дарог, якія абслугоўваюць работнікі камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскаблдарбуд», складала каля 14,5 тысячы кіламетраў. Для параўнання можна ўзгадаць, што такая адлеглась — больш чым трэць працяглас-ці экватара! Усе гэтыя дарогі — штодзённы клопат, карпатлівая праца вялікага калектыву. З 14,5 тыс. кіламетраў 4,8 тыс. км маюць удасканаленае пакрыццё (асфальтабетон, цементабетон), 6,6 тыс км — пакрыццё пераходнага тыпу (гравійнае, брукаванае) і каля 3 тыс. км — гэта грунтовыя дарогі. На мясцовай сеткі размешчаны больш чым 800 мастоў і каля 14 тысяч пагонных метраў водаправодных труб. Карацей кажучы, гэта ўнушальная пасадарная, якая патрабуе ўважлівага догляду, пільнай увагі, велізарнай працы.

7	ул. Плеханова, 1, подвал (защитное сооружение) (под непроизводственное – офис)	70,6	1020
8	ул. Я. Райниса, 17, 1 этаж, подвал (под склады)	99,66	1440
	КУП «ЖРЭО Ленинского района г. Минска» тел. 223-35-03		
9	ул. Комсомольская, 27, помещение на 1 этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел, вход через подъезд (под непроизводственное – офис)	46,9	680
10	ул. Свердлова, 15, подвальное помещение, имеется естественное освещение, отопление, отдельный вход, отсутствует санузел, требуется ремонт (под склад)	104,49	1510
11	ул. Фабричная, 26, помещение на 1 этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования, требуется ремонт, вход через подвал (под непроизводственное – офис)	19,35	280
	КУП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска» тел. 213-29-60, 224-53-76		
12	ул. Асаналиева, 4, помещение на 1 этаже в жилом доме (под непроизводственное – офис, смешанное (кроме торговли и бытовых услуг) использование	20,69	300
13	ул. Асаналиева, 40, кор. 1, помещение на 2 этаже в отдельно стоящем здании (под непроизводственное – офис, смешанное (кроме торговли и бытовых услуг) использование	16,65	240
14	ул. Чкалова, 18/2, цокольный этаж в жилом доме, требуется ремонт (под непроизводственное – офис, смешанное (кроме торговли и бытовых услуг) использование	108,4	1560
	КУП «ЖРЭО Московского района г. Минска» тел. 252-80-63, 207-10-89		
15	ул. Грушевская, 11, нежилое помещение в подвале жилого дома (под непроизводственное – офис)	28,06	410
16	ул. Слободская, 27, нежилое помещение на 2 этаже отдельно стоящего нежилого здания (под кафе)	592,57	25560
17	ул. Гебелева, 1, нежилое помещение в подвале жилого дома (под склад промышленных товаров, кроме товаров бытовой химии и парфюмерно-косметических товаров)	136,38	1970
	КУП «ЖРЭО Партизанского района» тел. 294-01-11		
18	пр. Независимости, 38, убежище, требуется ремонт (под непроизводственное – офис, склад, при условии выполнения требований МЧС)	71,5	1030
19	пр. Независимости, 40, убежище, требуется ремонт (под непроизводственное – офис, склад, при условии выполнения требований МЧС)	148,0	2130
20	ул. Долгобродская, 30, подвальное помещение, требуется ремонт (под непроизводственное – офис)	16,07	240
21	ул. З. Бядули, 3, убежище, требуется ремонт (под непроизводственное – офис, склад, при условии выполнения требований МЧС)	63,9	920
22	ул. З. Бядули, 12, убежище, требуется ремонт (под непроизводственное – офис, склад, при условии выполнения требований МЧС)	122,79	1770
23	ул. Козлова, 4, убежище, требуется ремонт (под непроизводственное – офис, склад, при условии выполнения требований МЧС)	116,4	1700
24	ул. Козлова, 12, убежище, требуется ремонт (под непроизводственное – офис, склад, при условии выполнения требований МЧС)	74,4	1070
25	ул. Первомайская, 15, убежище, требуется ремонт (под непроизводственное – офис, склад)	102,9	1480
26	ул. Солтыса, 54, помещение на 1 этаже, требуется ремонт (под напроизводственное – офис)	16,6	240
	КУП «ЖРЭО Первомайского района» тел. 285-72-92		
27	ул. К. Чорного, 21б, защитное сооружение (под склад) при условии выполнения требований МЧС	96,0	1400
	КУП «ЖРЭО Советского района» тел. 292-74-31, 292-56-01		
28	ул. Восточная, 38, помещение в цоколе, требуется ремонт, отсутствует санузел, отдельный вход со двора, в доме ведется капремонт (под непроизводственное – офис)	55,49	800
29	ул. Некрасова, 19, 1 этаж, подъезд № 5, отсутствует система отопления, имеется отдельный вход (под склад)	2,22	390
30	ул. Некрасова, 19, 1 этаж, подъезд № 6, отсутствует система отопления, имеется отдельный вход (под склад)	3,03	523
31	ул. Гамарника, 20, 1 этаж, вход совместно с жильцами через подъезд (под непроизводственное – офис)	29,58	430
	КУП «ЖРЭО № 2 Фрунзенского района г. Минска» тел. 253-03-26		
32	ул. Ольшевского, 23, подвал жилого дома, отдельный вход, все удобства, (под непроизводственное – офис, смешанные цели)	101,5	1460
	КУП «ЖРЭО № 1 Фрунзенского района г. Минска» тел. 204-30-46		
33	ул. Бурдейного, 13, помещение на 2 этаже отдельно стоящего здания со всеми удобствами, отдельный вход (под объект общественного питания)	200,7	17320

№ лота	Адрес, тип помещения, целевое назначение	Арендуемая площадь, кв.м	Начальная цена, тыс. руб.
	КУП «ЖРЭО Центрального района г. Минска» тел. 203-79-43, 203-34-66		
34	ул. Ленина, 2, убежище, с условием приведения помещения в надлежащее состояние (под размещение студии звукозаписи, при условии выполнения требований МЧС)	107,44	1550
35	ул. Коммунистическая, 4, подвал, вход через арендуемое помещение (под непроизводственное, производственное использование)	34,58	500
	КУП «Минская спадчина» тел. 226-53-04		
36	ул. Старовиленская, 10, двухэтажное здание с подвалом, отсутствует электро-, водо-, теплоснабжение, требует реконструкции (под торговый объект, объект общественного питания)	2037,0	29300
	ТКДУП «Минский метрополитен» тел. 219-50-57		
37	Станция метро «Октябрьская», помещение в пешеходном переходе ВБ-1 (под торговый объект)	81,45	7080
	ГУО «Специальная общеобразовательная школа № 14 для детей с нарушением слуха» тел. 280-02-42		
38	ул. Севастопольская, 54, помещение в здании школы (под непроизводственное – офис)	56,4	820
	Комитет по здравоохранению Мингорисполкома УЗ «8-я городская детская поликлиника», тел. 276-17-99		
39	ул. Есенина, 66, площадь в части коридора на 2 этаже поликлиники (под торговый объект по продаже книгопечатной продукции, не подпадающей под условия предоставления помещения в безвозмездное пользование)	6,0	1040
	УЗ «28-я городская поликлиника» тел. 223-59-47		
40	ул. Гинтовта, 28, площадь в фойе 1 этажа поликлиники (под торговый объект по реализации оздоровительного питания и лечебной косметики)	15,0	1300
	Главное управление потребительского рынка Мингорисполкома тел. 220-51-34, 219-00-78		
41	ТЦ «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 19 (под розничную торговлю непродовольственными товарами)	30,0	1300
42	ТЦ «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 23 (под розничную торговлю непродовольственными товарами)	14,6	630
	КУП «Минский Комаровский рынок» тел. 331-84-00		
43	ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного (открытого) рынка, сектор № 1 ряд 10 киоск № 5 (под торговлю продовольственными или непродовольственными товарами)	3,6	620
44	ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного (открытого) рынка, сектор № 1 ряд 10 киоск № 11 (под торговлю продовольственными или непродовольственными товарами)	3,6	620
45	ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного (открытого) рынка, сектор № 1 ряд 11 киоск № 10 (под торговлю продовольственными или непродовольственными товарами)	4,0	690
46	ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного (открытого) рынка, сектор № 3 ряд 11 киоск № 8 (под торговлю продовольственными или непродовольственными товарами)	3,7	640
47	ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного (открытого) рынка, сектор № 3 ряд 11 киоск № 10 (под торговлю продовольственными или непродовольственными товарами)	3,7	640
	УП «Бытэкс» тел. 306-43-92, 203-79-66		
48	ул. Гамарника, 22-1, два помещения на 1 этаже с естественным освещением (под бытовые услуги по согласованию с балансодержателем, под непроизводственное – офис)	29,9	430
	УП «Отдых» тел. 253-20-00, 255-11-07		
49	ул. Сурганова, 76, площадь 17,1 кв.м в торговом зале на 1 этаже с естественным освещением, помещение 22,97 кв. м на 2 этаже без естественного освещения (под торговый объект, склад)	40,07	3500
	УП «Автобаза УБОНМ» тел. 200-99-90		
50	Пер. Ольшевского, 7, нежилое помещение в здании диспетчерской, второй этаж, отсутсвует канализация и водоснабжение (под непроизводственное – офис)	11,61	170
	Охранно-эксплуатационное коммунальное унитарное предприятие «Гаражи, автостоянки и парковки» тел. 226-11-85, 252-02-16		
51	тер. Подземные переходы д. 13, (подземный общественно-торговый центр с паркингом) торговый объект № 62 (под розничную торговлю непродовольственными товарами)	46,8	2020
52	тер. Подземные переходы д. 13, (подземный общественно-торговый центр с паркингом) помещение № 56 (под розничную торговлю непродовольственными товарами)	47,55	2050
	Главное управление внутренних дел Мингорисполкома тел. 229-49-08		
53	ул. Орловская, 58/1, помещение под пункт общественного питания (кафе)	253,0	3640
	ОАО «Стройтрест № 1» тел. 294-21-35		
54	ул. Пугачевская, 3, помещение на 2 этаже – комната № 222, телефон не предоставляется (под непроизводственное — офис)	22,49	330
	ЖЭУ УП «УДМС и Б Мингорисполкома» тел. 203-13-23		
55	ул. Короля, 9, помещение на 5 этаже – комната № 530/1 (под непроизводственное – офис)	25,23	1110
	УП «Минские вторичные ресурсы» тел. 242-73-85		
56	14-й км Могилевского шоссе, д. Тростенец, помещение столовой на 1 этаже, имеется естественное освещение и электроснабжение (под производство)	319,5	4600
57	ул. Летняя, 38а, помещение в одноэтажном здании, имеется естественное освещение, электроснабжение, водоснабжение и отопление (под непроизводственное – офис)	6,78	100

**В отдельных случаях договор аренды может быть заключен на срок 11 месяцев. При этом Мингорисполком гарантирует победителю аукциона продление заключенного договора аренды в течение пяти лет.*

Организатор аукциона (продавец) – КУП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

Участник аукциона до начала его проведения должен выяснить у балансодержателя возможность использования помещения под планируемые виды деятельности, в том числе с учетом требований по санитарным и противопожарным нормам.

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота (лота с наибольшей стоимостью – в случае участия в торгах по нескольким лотам) и плату за участие в аукционе в размере 4 базовых величин на расчетный счет 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Перечень и порядок подачи документов определены условиями проведения аукциона, которые **предоставляет участникам торгов организатор аукциона** после публикации извещения в газете «Звязда».

Условия и сроки оплаты: разовый платеж в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в установленном порядке в 30-дневный срок с даты принятия решения Мингорисполкома.

Аукцион состоится 31 октября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Документы на участие принимаются по 30 октября 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефоны для справок (017) 227-40-22, 227-48-36. Интернет: www.mgcn.by.

Целевое назначение помещений определяется в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 30 сентября 2002 г. № 495 «О совершенствовании порядка определения размеров арендной платы и передачи в безвозмездное пользование общественных, административных и переоборудованных производственных зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности» и предусматривает:

- ***«непроизводственное целевое использование»*** – использование помещений для размещения руководителей, специалистов высшего уровня квалификации по предпринимательской деятельности и кадрам, в области права, в области общественных и родственных наук (в соответствии с общегосударственным классификатором «Профессии рабочих и должности служащих»), а также индивидуальных предпринимателей, осуществляющих в установленном порядке деятельность с привлечением физических лиц по трудовым и (или) гражданско-правовым договорам;
- ***«смешанное целевое использование»*** – использование помещения одновременно в производственных и непроизводственных целях;
- ***«производственное целевое использование»*** – использование помещения непосредственно для выпуска продукции, выполнения работ и оказания услуг с размещением на арендуемых площадях рабочих и специалистов, а также для складирования продукции, товаров. К помещениям производственного целевого использования относятся также помещения актовых, спортивных, выставочных залов, подсобные помещения, предназначенные для обслуживания деятельности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей (кладовые, раздевалки, умывальники, комнаты для приема пищи), др.

Порядок определения размеров арендной платы при сдаче в аренду зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности, установлен Указами Президента Республики Беларусь от 30 сентября 2002 г. № 495 «О совершенствовании порядка определения размеров арендной платы и передачи в безвозмездное пользование общественных, административных и переоборудованных производственных зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности» и от 4 августа 2006 г. № 498 «О некоторых вопросах аренды государственного имущества».

Арендуемая площадь – площадь, сдаваемая в аренду, размер которой определяется умножением нормируемой площади на коэффициент перевода.

УНП 190398583

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

«19» ноября 2008 года в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5

ПРОВОДИТ АУКЦИОН С УСЛОВИЯМИ

по продаже объекта, находящегося в собственности Солигорского района, и права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания

На аукционные торги выставляется предмет аукциона, включающий:

Здание химчистки (инв. № 644/С-34577), расположенное по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Коммунальная, 14, 1962 года постройки, общей площадью 593,8 кв.м. Одноэтажное, фундамент бетонный ленточный, стены кирпичные, облицованные плиткой, перегородки кирпичные, перекрытия — железобетонные плиты, крыша совмещенная, полы бетонные, плиточные. Инженерные коммуникации отсутствуют.	**Право заключения договора аренды земельного участка**, площадью 0,1732 га, сроком на 30 лет, отведенного для обслуживания и эксплуатации здания химчистки. Имеются ограничения в использовании земельного участка площадью 0,0869 га – охранная зона магистрального трубопровода, хозяйственно-бытовой канализации и теплотрассы.

Условия аукциона: продажа здания химчистки с выполнением его ремонта и благоустройства прилегающей территории.

Начальная цена предмета аукциона **129 561 828** рублей (в том числе: имущество – 82 905 418 рублей и право заключения договора аренды земельного участка – 46 656 410 рублей).

Сумма задатка предмета аукциона — 10 000 000 руб.

Продавец недвижимого имущества: Коммунальное унитарное предприятие «Солигорский районный комбинат бытового обслуживания», расположенное по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Ленина, 51, тел. (80174) 247790.

Арендодатель земельного участка: Солигорский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия Солигорским райисполкомом решения о представлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды.

После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» **№ 3642000000028** в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи заявок 17 ноября 2008 г. до 13.00.

МТБанк
МИНСКИЙ ТРАНЗИТНЫЙ БАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2008 года

Наименование банка: ЗАО «Минский транзитный банк», г. Минск

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	П-т прим.	2008 г.	2007 г.
1	*2*	*3*	*4*	*5*	*6*
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	20 995,8	12 893,5
3	Средства в Национальном Банке РБ	1102	2	13 237,4	13 181,9
4	Ценные бумаги:	1103		43 010,9	36 613,0
	для торговли	11031	3	103,8	0,0
	удерживаемые до погашения	11032	3,1	3 000,8	3 000,0
	в наличии для продажи	11033	3,2	39 906,3	33 613,0
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	37 723,8	8 425,2
6	Кредиты клиентам	1106	5	263 391,1	155 213,1
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	0,0	0,0
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	6 404,7	5 198,8
9	Прочие активы	1109	8	6 878,5	2 215,6
10	ИТОГО активы	110		391 642,2	233 741,1
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального Банка РБ	1202	9	612,5	262,8
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	90 857,3	49 691,7
14	Средства клиентов	1206	11	186 042,4	132 858,0
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		447,3	5,0
16	Прочие обязательства	1209	12	5 700,2	5 773,5
17	ВСЕГО обязательства	120		283 659,7	188 591,0
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	65 116,5	20 334,0
20	Эмиссионные разницы	1212		0,0	0,0
21	Резервный фонд	1213		12 532,6	5 083,5
22	Накопленная прибыль	1214	14	28 076,8	17 877,4
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	2 256,6	1 855,2
24	Всего капитал	121		107 982,5	45 150,1
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		391 642,2	233 741,1
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	196 287,3	91 049,1
28	Обязательства	1302	17	107 515,8	57 473,0

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 3 квартал 2008 года

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	П-т прим.	2008 г.	2007 г.
1	*2*	*3*	*4*	*5*	*6*
1	Процентные доходы	2011		25 347,7	15 394,9
2	Процентные расходы	2012		10 799,9	7 933,8
3	Чистые процентные доходы	201	18	14 547,8	7 461,1
4	Комиссионные доходы	2021		16 241,3	9 726,6
5	Комиссионные расходы	2022		1 800,9	1 115,1
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	14 440,4	8 611,5
7	Чистый доход от операций с иностранной валютой	203	20	9 315,0	6 405,9
8	Чистый доход от операций с ценными бумагами	204	21	-99,9	-58,0
9	Доход в форме дивидендов	205		0,0	0,0
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	783,0	963,7
11	Прочие доходы	207	23	2 766,5	479,3
12	Операционные расходы	208	24	20 909,3	12 470,6
13	Прочие расходы	209	25	1 777,6	1 023,6
14	Налог на прибыль	210		3 638,1	1 997,7
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		13 861,8	6 444,2

Руководитель **А.К. Жишкевич**

Главный бухгалтер **В.В. Ермолович**

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 13 от 27.10.2006 г. УНП 100394906

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ЛЮБЛЮ НАШ КРАЙ

Бяседны песні

У Беларусі — жаночы лёс. Выпакутаваны і загартаваны, самаахвярны і прывабны. Па-мацярынску яна і любіць, і шануе, і аберагае сваіх насельнікаў. І гэтак як маці, цярпліва чакае лагоднай ласкі ад іх...

Любоў выяўляецца не толькі прылежнай справай. Пранікнёна і шчыра выказваюцца замілаванне і ўдзячнасць у песнях. Родных, наскіх. У іх і словы, і мелодыя ўзнікаюць ад навакольнай прасторы, ад яе харства. Песнямі наладжваюцца сумоўе і паразуменне. Беларусь чакае ад сваіх дачок і сыноў задушэўнага, маладзячнага спеву. І калі яны верныя зямлі маленства, роднаму кутку — песняй перададуць свае пачуцці, спадзванні, мары. І родны край заўсёды пачуе іх, абавязкова адчуе, дзе б яны ні былі. І падтрымае...

На бяседзе — сяброўскай ці абрадавай — адной з першых спяваюць песню «Люблю наш край», якая даўно стала народнай. На Беласточчыне яна лічыцца своеасаблівым гімнам для беларусаў. Там гэтая песня яднае іх і духоўна сілкуе. Словы вернасці роднай зямлі, што на пачатку мінулага стагоддзя па-мастацку ўвасобіла Канстанцыя Буйло, блізка ўспрымаюцца і наладжэнцамі нашага краю. Гэта яны шчымліва адчуваюць, калі выязджаюць за мяжу. А каб быць духоўна разам — трэба спяваць.

Люблю наш край — старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла,
Дзе першы раз спазнала шасце,
Слязу нядолі праліла.

Люблю народ наш беларускі
І хаты ў зелені садоў,
Залочаныя збожжам нівы,
Шум нашых гаяў і лясоў.

І жніва час душой люблю я,
І першы звон сярпоў і кос,
Калі на поле выйдуць жнеі,
А касары на сенакос.

І песню родную люблю я,
Што ў полі жнеі запяюць
Як гукі звонкія над нівай
Пераліваюцца, плывуць.

Люблю ў калядную я ночку
Дапозна ў садзіку сядзець,
Сачыць за ясным зор мігценнем,
На месяц залаты глядзець.

Мне тут усё для сэрца міла,
Бо я люблю край родны свой,
Дзе з першым шчасцем я спазналась
І з першай горкаю слязой.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

Віншуем мудрую, добрасардэчную ***Тамару Рыгораўну РАССОЛ*** *з г. Гомеля з 80-годдзем. Жадаем моцнага здароўя і бадзёрага настрою на доўгія гады.*

Марыя Міхайлаўна і ўсе суседзі.

ЖУРЫ І ГЛЕДАЧЫ ПАДЗЕЛЯЦЬ АБАВЯЗКІ

«Еўрабачанне-2009»

Нацыянальны адбор на міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне» праходзіць сёлета па змененых правілах. У прыватнасці, гэта датычыцца працэдуры галасавання ў паўфінале і фінале.

Пры вызначэнні фіналістаў адбору (не больш як 5 удзельнікаў) у снежні будзе ўлічвацца толькі меркаванне прафесійнага журы. Фіналістам пры неабходнасці дазваляецца памяняць песню, але выбіраць можна будзе толькі з тых 20—30 кампазіцый, якія зноў жа з ліку дасланых заявак папярэдне вызначыць журы. Дарэчы, калі ў якасці выканаўцаў да ўдзелу ў нацыянальным адборы — праекце «ЕўраФэст» — дапускаюцца толькі грамадзяне Беларусі і асобы, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі рэспублікі, то дасыланыя свае песні могуць любыя аўтары, незалежна ад грамадзянства. Пераможцу адбору ў студзені наступнага года вызначаць тэлефонным галасаваннем толькі тэлегледачы. Праўда, выбіраць яны будуць усё адно з тых кандыдатаў, каго ўжо «адобрыла» журы...

Ёсць навіны і наконт дзіцячага конкурсу «Еўрабачанне», які пройдзе сёлета 22 лістапада ў горадзе Лімасол на Кіпры. Выканаўчы прадзюсар тэлеканала «ЛАД» Людміла Барадзіна паведаміла, што беларускія ўдзельнікі — дзявочае трыа Дар'я Надзіна, Карына Жуковіч і Аліна Молаш — будуць выступаць пад трэцім нумарам. Адкрые конкурс дуэт з Румыніі, а апошнімі, паводле жараб'ёўкі, прадстаўнікі Кіпра. Усяго ў дзіцячым «Еўрабачанні» ўдзельнічаюць сёлета 15 краін.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

СЕЗОННЫЯ КЛОПАТЫ

Цяпло для нашых рук

Скура рук патрабуе аховы, асабліва ў халодную пару года. Самы час набыць пальчаткі. Сёння іх вяжуць, ткуць, шыюць з розных матэрыялаў, таму зрабіць выбар даволі складана. Паспрабуем ацаніць вартасці і недахопы самых хадавых.

Каралева сярод скуры — лайка

Гэта тонкі, шаўкавісты, з мяккім бляскам, вельмі эластычны матэрыял. Вырабляюць яго са скуры маладых казлянят і ягнят. Пальчаткі з лайкі сядзяць на руцэ нібы ўлітыя, аднак надзяваць іх трэба вельмі асцярожна, без спешкі, таму што мяккі матэрыял лёгка парваць адным рэзкім рухам.

Падыдзе мужчынам

Свіная скура, з якой таксама шыюць пальчаткі, таўсцейшая, яна дрэнна паддаецца расцягванню, не вельмі эластычная, затое даволі трывалая. Гэту якасць асабліва цэняць мужчыны, таму свіная скура часта выкарыстоўваецца для вырабу мужчынскіх пальчатак.

Ці патрэбны нам заменнік?

Сучасныя тэхналогіі дазволілі стварыць такія заменнікі скуры, якія выглядаюць не горш, чым арыгінал. Пры гэтым рэльеф, адстрочванні, знешняя мяккасць, нават пах іншы раз не адрозніваюцца ад пальчатак з натуральнай скуры. Розніцу вы адчуеце з наступленнем халадоў: прыгожыя новыя пальчаткі са скурзаменніку задубеюць, пачнуць даваць трэшчыны, рукі ў іх мерзнуць. Як жа адрозніць падробку? Галоўная асаблівасць, на якую можна арыентавацца пры пакупцы, — здольнасць скуры ўспрымаць і захоўваць цяпло. Сапраўдныя скураныя пальчаткі хутка нагрэюцца і нейкі час будуць заставацца цёплымі, а заменнік не сагрэш, ён застанецца халодным.

Замша

Яна, па сутнасці, — адваротны бок скуры, таму ў добрай замшы ворс амаль нябачны. Невысокай якасці замшу спецыялісты называюць «спілак» — гэта шкуры са «спілаваным» верхнім слоем скуры, ворс у іх бывае даволі доўгім. Аднак спілак доўга не носіцца, ён нетрывалы і хутка распаўзаецца.

Падкладка

Яна абавязкова павінна прысутнічаць у добрых пальчатках, інакш яны губляюць форму і скурчваюцца. Бываюць падкладкі з шоўку, шэрсці, натуральнага ці штучнага футра. На што ў першую чаргу неабходна звярнуць увагу? Ці не труць швы і ці не вылазіць падкладка з пальчаткі, калі вы яе знімаеце.

Швы

Вельмі ўважліва агледзьце швы: менавіта ад іх залежыць, ці не распаўзуцца вашы новыя пальчаткі праз некалькі дзён носкі. Праверце іх трываласць: расцягніце пальчатку ў месцы злучэння дэталяў і прагледзьце строчкі, ці няма пропускаў — гэта «залог» будучых праэхаў.

Афарбоўка

Яркія колеры могуць спакусіць пакупніка. Аднак часта здараецца, што такія пальчаткі фарбуюць скуру рук. Як гэта праверыць? Пратрыце пальчаткі светлай, злёгку ўвільготненай насоўкай — і вы адразу ўбачыце, ці дастаткова трывалая фарба. Іншы раз, каб прыкрыць дэфекты, ужо гатовыя пальчаткі фарбуюць яшчэ раз. Звярніце ўвагу на колер нітак у швах — у гэтым выпадку яны супадуць з колерам пальчатак. Ва ўсіх іншых выпадках ніткі будуць хоць крыху адрознівацца па колеры.

Такім чынам, вашы пальчаткі павінны быць:

— прыгожымі і зручнымі;
— мяккімі і эластычнымі;
— трывалымі і зносаўстойлівымі.

-2534-

МЕНЮ ЗДАРОЎЯ

На стале — бабовыя

Бабовыя (гарох, фасоля, боб і інш.) — лепшая крыніца бялку сярод усіх раслінных прадуктаў. Яны вызначаюцца яшчэ і вялікай колькасцю кальцыю, таму калі вы не п'яце малако, часцей гатуйце стравы з бабовых са свежым зяленівам. Іх рэгулярнае ўжыванне аказвае амаладжальнае дзеянне і садзейнічае прадаўжэнню жыцця.

На кухні

Практычна ўсе бабовыя перад гатаваннем лепш замачыць на некалькі гадзін у вадзе (4 шк. вады па 1 шк. бабовых). Час ад часу рэштку вады, якая не ўсмакталася, трэба зліваць, бабовыя прамываць і заліваць свежай вадой — гэта не толькі папярэдзіць закісанне, але і палепшыць засваяльнасць бабовых, бо разам з вадою выдаляецца лішак фіцінавай кіслаты. Гатаваць бабовыя трэба толькі ў свежай вадзе. Для гэтага лепш за ўсё прыдатныя каструлі з тоўстым дном і шчыльнай накрыўкай. Вада павінна пакрываць бабовыя на 2—3 см. З адной шклянкі сухіх пладоў атрымліваецца 2—2,5 шклянкі гатовых.

Маленькія хітрасці

● Бабовыя не варта саліць, пакуль яны не стануць мяккімі, — соль значна павялічвае час прыгатавання. Тое ж датычыцца і цукру, таматнай пасты, воцату і г.д.

● У працэсе гатавання ў бабовыя можна і трэба дадаваць цыбулю, часнок, лаўровы ліст, куркуму, марскія водарасці.

● Для лепшага засваення кальцыю ў гатовыя стравы з бабовых карысна дадаваць лімонны сок, воцат, сок квашанай капусты, смятану.

Салата з фасоляй

100 г кансерваванай чырвонай фасолі, 100 г адвараной белай фасолі, 100 г адвараных ялавічыны, 1 шк. натуральнага ёгурту, 1 ч. лыжка таматнай пасты, 1 ч. лыжка яблычнага воцату, зялёная цыбуля, пятрушка, соль, перац на смак.

Парэжце тонкай саломкай ялавічыну. Злучыце мяса з фасоляй, дробна пасечанай цыбуляй. Асобна прыгатуйце соус: змяшайце ёгурт, таматную пасту, воцат, соль, перац. Гатовым соусам паліце салату, перамяшайце, упрыгожце зялянінай пятрушкі.

Запяканка «Вясёлы боб»

500 г адваранага бобу, 400 г памідораў, 75 г расійскага сыру, 2 ст. лыжкі віннага воцату, 200 мл вады, буйная цыбуліна, зеляніна пятрушкі.

Адвараны і абсушаны боб раздзяліце на дзве роўныя часткі. Палову пакладзіце на дно гарачатрывалай каструлі, змазанай алеем. Нарэжце цыбулю кольцамі, а памідоры — кружочкамі і таксама раздзяліце на дзве часткі. Пакрыйце боб кольцамі цыбулі, затым памідорамі, пасыпце зялянінай пятрушкі. Паўтарыце слаі ў тым жа парадку. Уліце ваду, у якой папярэдне разбаўце вінны воцат. Пасаліце, пасыпце зверху надзёртым сырам, накрыйце накрыўкай, пастаўце ў духоўку на 5—7 хвілін. Затым зніміце накрыўку і пакіньце ў духоўцы яшчэ 5 хвілін, каб утварылася скарыначка.

Курыца на гарошыне

400 г адваранага да напаўгатоўнасці гароху, 200 г адваранага да напаўгатоўнасці рысу, 4 буйныя курыныя грудкі без скуры, 2 бананы, 0,5 шк. малака, 1 яйка, 1 ст. лыжка аліўкавага алею, 3—4 зубкі часнаку.

Натрыце курыныя грудкі соллю і здробненым часнаком, пастаўце на 1 гадзіну ў халадзільнік, затым 30 хвілін патушыце на аліўкавым алеі. Перамяшайце рыс і гарох у форме для запякання, змазанай алеем, заліце ўзбітым з малаком яйкам. Зверху, злёгку «ўтапіўшы», пакладзіце курыныя грудкі, абкладзіце іх бананавымі кружочкамі. Гатуйце ў духоўцы каля 20 хвілін пры тэмпературы 175°.

-2535-

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Блізняты будуць хутка перамяшчацца, а Скарпіёнам лепш маўчаць

ВАЕН. Вам дадуць магчымасць праявіць свае веды і вынаходлівасць: магчыма, хтосьці звернецца па параду, а магчыма, вы па сваёй волі прымеце ўдзел у чыімсьці лёсе. У панядзелак дакладна вызначце ўсё, што неабходна зрабіць на гэтым тыдні і ў бліжэйшую будучыню: такое планаванне дазволіць пазбегнуць сур'ёзных промахаў.

ЦЯЛЕЦ. Тэрмінова неабходна атрымаць новыя прафесійныя веды, запоўніць прабелы і праявіць сваю здольнасць да творчасці, каб не адчуваць сябе няёмка з-за асабістай некампетэнтнасці ў пэўных пытаннях. Дзеля ўмацавання аўтарытэту лепш назапасіць цярпенне і ні ў якім разе не прыспешваць падзеі, якія адбываюцца навокал.

БЛІЗНЯТЫ. Самае важнае — гэта засяродзіцца і паспець быць на месцы своечасова. Можа спатрэбіцца здольнасць хутка перамяшчацца. Амаль усе справы будуць паспяховымі. Магчымыя каманд-зіроўкі, якія будуць спрыяць паляпшэнню матэрыяльнага становішча. Пастарайцеся не адкладваць справы, якія назапасіліся, а, па магчымасці, вырашаць іх адразу.

РАК. Праяўляючы актыўнасць і ініцыятыву, можаце зацікавіць сяброў арыгінальнымі ідэямі і задумамі. Поспех патрабуе старанной падрыхтоўкі планаў і праверкі неабходнай інфармацыі. У канцы тыдня можа ўзнікнуць неабходнасць у дзеяннях і пераменах, але ажыццяўляць іх неабходна вельмі асцярожна. Запланаваны на пятніцу візіт да сяброў лепш адкласці.

ЛЕЎ. Галоўнае — быць больш актыўнымі на працягу ўсяго тыдня і не забывацца на паслядоўнасць дзеянняў. Непажадана легкадумна раздаваць абяцанні, бо з іх выкананнем могуць узнікнуць праблемы. Наладжвайце новыя сувязі і кантакты. У панядзелак і аўторак лепш не трапляцца на вочы начальству, а пачынаючы з серады можаце смела ўносіць канструктыўныя прапановы.

ДЗЕВА. Пра спакойнае жыццё можаце забыцца, затое тыдзень абяцае быць жывым і цікавым. Давядзецца прымаць рашэнні. Вызначце праграму-мінімум і прыступайце да дзеянняў. Галоўная задача — нічога не забыцца. У панядзелак толькі старанна-ссць і мэтанакіраванасць дапамогуць дасягнуць жаданых вынікаў.

ШАЛІ. Можаце пераадолець практычна ўсе цяжкасці, якія ўзнікаюць на вашым шляху. Спрыяльны момант для дзелавых знаёмстваў і набыцця надзейных партнёраў. У аўторак пастарайцеся выконваць абяцанні, інакш верагодныя непрыемнасці ва ўзаемаадносінах з начальствам. У чацвер лепш прамаўчаць — канфлікт вам абсалютна не патрэбен.

СКАРПІЁН. У панядзелак уважліва сачыце за сваім маўленнем — гэта пазбавіць ад разборак і не дасць шанцу нядобразычліўцам умяшацца ў ход падзей. У аўторак можаце сутыкнуцца з рознымі бюракратычнымі праблемамі. Не прымайце гэта за паражэнне. Чацвер — дзень для старанной працы: заўважайце нават нязначныя дробязі.

СТРАЛЕЦ. Эгацэнтрызм — не ваш стыль. Вы, зразумела, самы прывабны чалавек і дастойны ўсякай пахвалы, але не варта займацца выключна самазахапленнем. Агледзьцеся: раптам камусьці з вашых знаёмых патрэбна дапамога. У панядзелак не варта выхоўваць людзей, калі не хочаце трапіць пад шквал іх эмоцый.

КАЗЯРОГ. У пачатку тыдня пастарайцеся праявіць вытрымку і дыпламатычнасць. Непаразуменні з калегамі павінны быць урэгуляваны выключна ў парламенцкіх выказваннях, як бы вам ні хацелася прымяніць больш моцныя сродкі. Абставіны ўсімі сіламі будуць падштурхоўваць вас да перагляду многіх прынцыпаў. Можаце завязаць мноства цікавых і карысных знаёмстваў, асабліва пасля чацвярга.

ВАДАЛЕЙ. Паспяховасць будзе напрамую залежаць ад навядзення парадку ў справах і быце, а арганізаванасць, верагодней за ўсё, адыграе ў гэтай сітуацыі не апошнюю ролю. Работу з важнай дакументацыяй у сераду плануйце не варта, бо крыўдныя памылкі і недакладнасці практычна непазбежныя. Максімальна выкарыстайце выхадныя дні для навядзення парадку ў жыцці.

РЫБЫ. Вы ў цэнтры ўвагі, вас акружаюць тайны і загадкі, нават плёткі робяць вам выдатную рэкламу. Вы адкрытыя для стасункаў і прываблівыя, віхор новых сустрэч і знаёмстваў ахоплівае вас. А вось на працы не варта залішне капрызіць і прыдзірацца па дробязях — такімі дзеяннямі можаце настроіць калег супраць сябе. Самы час чакаць цудоўнага сюрпрызу.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.44	18.05	10.21
Віцебск —	7.36	17.52	10.16
Магілёў —	7.34	17.55	10.21
Гомель —	7.27	17.55	10.28
Гродна —	7.58	18.20	10.22
Брэст —	7.56	18.24	10.28

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. *Аляксея, Гаўрылы, Дзям'яна, Ерамея, Іоны, Мацвея, Піліпа, Пятра, Рыгора.*

К. *Ганны, Лукі, Пятра, Юльяна.*

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА +12..+14°C	КІЕЎ +12..+14°C	РЫГА +8..+10°C
ВІЛЬНЮС +7..+9°C	МАСКВА +7..+9°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ +7..+9°C

Дзве даты

18 кастрычніка

1908 год — у вёсцы Старынцы Полацкага раёна нарадзіўся Павел Емяльянавіч Купрыянаў, першы беларус, які быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза (1936 год). З 1929 года служыў у Чырвонай Арміі. З кастрычніка 1936-га — удзельнік грамадзянскай вайны ў Іспаніі на баку рэспубліканцаў, камандзір танка. Вызначыўся ў баях пад Мадрыдам. Загінуў у баі ў лістападзе 1936 года.

1896 год — поўным правалам завяршылася прэм'ера п'есы Антона Чэхава «Чайка», пасля чаго ён заявіў, што больш ніколі не будзе пісаць для сцэны.

Цытата дня:

«Армейская дысцыпліна цяжкая, але гэта цяжар шчыта, а не ярма».

Антуан дэ Рыварольі (1753—1801), французскі пісьменнік.

ДАВАЦЬ І БРАЦЬ

свет і сусвет
чалавека

У народнай культуры лічылі, што з перадачай рэчаў можна перадаць (аддаць) і адпаведна атрымаць дабрабыт, «спор», поспех, шчасце. Таму ў нормах побытавага этыкету і паводзінаў нашага народа існаваў шэраг правілаў, якіх неабходна было прытрымлівацца, калі вы пазычаеце, дорыце ці атрымліваеце тыя ці іншыя рэчы, грошы і г.д.

● Нельга было нічога аддаваць з дому ў вялікія народныя ці царкоўныя святы, пасля захаду сонца, на пачатку і пасля заканчэння сельскагаспадарчых работ. Лічылася, што ў адваротным выпадку ў гаспадароў перастане весціся хатняя жывёла, узнікнуць непрыемнасці, адным словам — як «сыходзіць» сонца, так «сыйдуць» з хаты і дабрабыт, і шчасце.

● Самая строгая забарона на вынас чагосьці з хаты накладаецца на перыяд святкавання Калядаў і асноўных святочных дзён: Ражаства Хрыстовага (Першая куцця), Новага года (Другая куцця) і Вадохрышча (Трэцяя куцця), інакш поспех і дабрабыт «адвернуцца» ад гэтай хаты на ўвесь год.

● Каб не жыць з адвечнай пазыкай і ў нястачы, неабходна было напярэдадні Новага года абавязкова вярнуць усе пазыкі гаспадарам.

● Таксама асабліваю увагай надзялялі той перыяд часу, калі пачыналіся сельскагаспадарчыя работы: калі ў час ворыва ці севу з хаты што-небудзь аддаць ці пазычыць камусьці, ураджай і рост раслін адыдзе да таго, хто браў тыя ці іншыя рэчы.

● Ніколі не аддавалі штосьці ці не пазычалі ў той дзень, калі з дому ад'язджаў хто-небудзь са сваякоў. Лічылася, што выкананне гэтай забароны будзе спрыяць добраму шляху і вяртанню дадому таго, хто знаходзіўся ў вандроўцы.

● Першыя тры дні пасля нараджэння дзіцяці надзялялася асабліваю сакральнасцю. Лічылася, што калі ў гэтыя дні штосьці пазычыць ці аддаць з хаты, то дзіця «будзе цурацца роднай хаты», г.зн. будзе вандроўнікам ці перакаціполем», а можа нават стаць рабаўніком.

● Ніколі не пазычалі што-небудзь у панядзелак. Лічылася, што ў такім выпадку ўвесь тыдзень «пойдзе прахам».

● Калі аддавалі з хаты прадукты харчавання, напрыклад, хлеб, малако, муку, сачыліся, каб не аддаць апошняе, інакш сам застанешся без усяго.

● Неруплівых гаспадынь, якія прыходзілі ўвечары святочнага дня ў хату і прасілі крыху солі, у вёсках лічылі ведзьмамі, якія здольны забраць з хаты «спор», дабрабыт.

● Хлеб, як і іншыя прадукты ці рэчы, ніколі не перадавалі праз парог, каб з хаты не пайшоў дабрабыт.

● У Беларусі былі ўпэўнены ў тым, што ў той момант, калі ў хаце знаходзіцца нябожчык, з хаты нельга нічога браць, выносіць і г.д., таму што лічылася, што «перанясеш» смерць у іншую хату.

● У той жа час у дні ўшанавання продкаў неабходна было раздаваць прадукты харчавання, рэчы, грошы. Але зноў-такі, існавала строгае правіла: міласціну давалі пры ўваходзе на могілкі, пры выхадзе з могілак — ніколі!

● Калі пазычалі іголку, у якасці ахоўнага сродку яе неабходна было аддаваць з доўгай ніткай і такім жа чынам вяртаць гаспадару.

● І сёння ў народзе існуе няпісаное правіла не адмаўляць у просьбе перадачы якіх-небудзь рэчаў, прадуктаў харчавання цяжарнай жанчыне. Калі ёй адмаўлялі, пакаранне не вымушала сябе чакаць: хату «апаноўвалі» пацукі і наносілі вялікую шкоду гаспадарцы, часам нават адбываўся пажар.

КАЛІ ВЫ ЧАСТА ПАЗЫЧАЕЦЕ І НЕ МОЖАЦЕ РАЗЛІЧЫЦЦА

Вазьміце ў Чысты чацвер сіта, пакладзіце ў яго манеты, раніцай выйдзіце на вуліцу і «пасейце» медзякі ў снег, сказаўшы пры гэтым:

«У імя Айца і Сына і святога Духа. Маці-Зямля, сястрыца-Зямліца, прымі зерне, дай мне і маёй сям'і доўгага ўраджаю, доўгага часу. Амін».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

На абочыне дарогі стаіць чалавек з каровай і галасуе. Спыняецца «Масквіч». Мужчына просіць падвезці яго да вёскі. Кіроўца падвольна паехаў, а карова затрусіла ззаду.

— Ды вы хутчэй едзьце, — кажа гаспадар каровы, — яна дагоніць.

Дадаў кіроўца хуткасць, карова пабегла хутчэй.

— Ды дзьмі на ўсю шпульку, — патрабуе мужык.

Машына пайшла з хуткасцю 60 кіламетраў. Карова бяжыць ззаду, не адстае. Кіроўца ўзіраецца ў люстэрка задняга і крычыць гаспадару:

— Паслухайце, я хутчэй не магу, з каровай будзе дрэнна, яна неяк дзіўна міргае левым вокам!

Гаспадар каровы (*спакойна*):

— На абгон пайшла...

☺

Ідэальная ступень ап'янення — гэта калі ўжо спяваеш, але яшчэ не падаеш.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.350 Індэкс 63850. Зак. № 5758. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12